ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца
з 9 жніўня 1917 г.

9 ЛІСТАПАДА 2017 г. ЧАЦВЕР №216 (28580)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



## Навошта ратавальніку прабірка?



## Школьная дэмакратыя па-чэшску



## Дапамагчы ўсміхнуцца

*ЛІЧБА ДНЯ*

**На 22%**

*у параўнанні з аналагічным перыядам 2016 года ўзрос сёлета за студзень — верасень паток транспартных сродкаў праз мытную мяжу краіны. Такая інфармацыя размешчана на сайце Дзяржаўнага мытнага камітэта. У гэтым годзе праз мытную мяжу Беларусі ўжо прайшло каля 6,2 млн транспартных сродкаў, што больш чым на 1 млн перавышае паказчык за дзевяць месяцаў мінулага года. З іх каля 4,5 млн легкавых і больш за 1,5 млн грузавых аўтамабіляў. Павелічэнне патоку транспартных сродкаў, якія ідуць праз мытную мяжу Беларусі, сведчыць аб павышэнні транзітнай прывабнасці краіны.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 09.11.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9908 | ▲ |
| Еўра | 2,3082 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0336 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0747 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# МОРКВАПАД У ЯЧАВЕ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Жыхар вёскі Ячава Слуцкага раёна Аляксандр МІРОНЧЫК (на фота злева) на сваёй уласнай падсобнай гаспадарцы — на плошчы 1,7 гектара — ужо трэці год вырошчвае капусту, агуркі, бульбу, цыбулю, буракі. Сваю прадукцыю ён прадае на восеньскіх кірмашах. Цяпер малады гаспадар заканчвае збіраць моркву. Яму дапамагае старэйшы брат Мікалай.

■ Мінскія хронікі

## ВЫРАШЫЦЬ ЖЫЛЛЁВАЕ ПЫТАННЕ І НАВАТ НАЛАДЗІЦЬ ЖЫЦЦЁ

### Чым можа дапамагчы экскурсія па цэнтры Мінска

**Цэнтр горада, часцей за ўсё, — гэта тая тэрыторыя, дзе сяліліся першыя мясцовыя жыхары, той пункт, з якога пачалася яго гісторыя. «Звязда» прагулялася разам з экскурсаводам Юліяй САКАЛОВАЙ па Нямізе і Верхнім горадзе, каб пановаму зірнуць на «сэрца» сталіцы.**

СТАР. 4



■ Тэхналогіі

## ПАЎСТАННЕ МАШЫН

### Як можа змяніцца рынак працы з выкарыстаннем штучнага інтэлекту



**Машыны наступаюць на пяткі прадстаўнікам многіх прафесій. Робаты і аўтаматызацыя ўкараняюцца ва ўсё большую колькасць сфер жыцця. Падчас ХІХ Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў футуролагі, прадстаўнікі індустрыі інфармацыйных тэхналогій і журналісты задаліся пытаннем: наколькі сёння актуальная праблема паўстання машын, як будучая чацвёртая прамысловая рэвалюцыя паўплывае на працоўныя месцы? Найбольш гарачае абмеркаванне гэтых праблем прайшло падчас панэльнай дыскусіі «Робаты наступаюць: што нас чакае заўтра?».**

### НЕ ГУБЛЯЦЬ КРЫТЫЧНАЕ МЫСЛЕННЕ

Адзін са стваральнікаў і былы найбуйнейшы акцыянер кампаніі Майкрасофт Біл Гейтс казаў, што заўсёды будзе шукаць лянівага чалавека для работы, бо той знойдзе шмат лёгкіх шляхоў для вырашэння пастаўленай задачы. Ён агучыў тое, пра што многія кіраўнікі кампаній думалі заўсёды: максімальная аўтаматызацыя, меншая колькасць аперацый для выканання задач, кантроль над колькасцю супрацоўнікаў.

СТАР. 4

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПАДПІШЫСЯ — І ВЫЙГРАЙ КАШТОЎНЫЯ ПРЫЗЫ!

Пачалася падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2018 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# Калі грошы на другім плане

## Прэзідэнт сустрэўся з кіраўніком Міжнароднага камітэта Чырвонага Крыжа

**Гуманітарнае супрацоўніцтва стала ключавой тэмай учарашняй сустрэчы кіраўніка нашай дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі і прэзідэнта Міжнароднага камітэта Чырвонага Крыжа (МКЧК) Петэра МАЎРЭРА.**

— Я ўважліва па сродках масавай інфармацыі адсочваў ход вашага візіту ў Беларусь, — прызнаўся беларускі лідар. — Вы сказалі, што гэта ваш першы візіт як кіраўніка Чырвонага Крыжа ў нашу краіну. І я падумаў пра тое, што гэты візіт павінен быць значным.

На думку Аляксандра Лукашэнкі, візіт павінен быць сімвалічным і ўзнімаць адносіны Беларусі і Міжнароднага камітэта Чырвонага Крыжа на новы ўзровень.

— Наша з вамі сённяшняя работа па адкрыцці офіса МКЧК у Беларусі пра многае сведчыць і мы гэта вельмі высока цэнім. Гэта якраз і будзе новай старонкай у нашых адносінах, якая дадасць туды больш перспектывы і больш надзей.

Трэба сказаць, што МКЧК мае сетку рэгіянальных прадстаўніцтваў (дэлегацый) па ўсім свеце. У 1992 годзе ў Маскве было адкрыта рэгіянальнае прадстаўніцтва гэтай арганізацыі для Расіі, Беларусі і Малдовы. Менавіта праз гэты офіс сёння здзяйсняецца супрацоўніцтва паміж нашай дзяржавай і Чырвоным Крыжам. Прадстаўніцтва падтрымлівае цесныя сувязі з Нацыянальнай камісіяй па імплементацыі міжнароднага гуманітарнага права пры Савеце Міністраў нашай дзяржавы, міністэрствамі юстыцыі, замежных спраў, па надзвычайных сітуацыях, унутраных спраў, абароны... Сумесна з апошнім, дарэчы, толькі за апошнія пяць гадоў МКЧК правёў больш за 20 сумесных мерапрыемстваў, а сёлета ў верасні прадстаўнікі МКЧК прынялі ўдзел у назіранні за беларуска-расійскімі стратэгічнымі вучэннямі «Захад-2017».

— Вы здзяйсняеце самую вялікую місію ў свеце з усіх міжнародных арганізацый, — адзначыў кіраўнік краіны. — Вы заўсёды побач з тымі людзьмі, што трапілі ў бяду... Вы на нас можаце разлічваць.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што пасля канфлікту ва Украіне Беларусь прыняла больш за 150 тысяч бежанцаў, забяспечыла іх усім неабходным.

— Фактычна, мы паставілі ўпоравень нашых украінскіх братоў з беларусамі, — звярнуў увагу беларускі лідар. — Як вы разумееце, гэта ўсё каштавала нам значных выдаткаў. Але мы іх не лічым, паколькі людзі трапілі ў бяду, і тут затраты наўрад ці маюць нейкі падлік.

Беларусь ніколі не была ўбаку і ад той вайны, якая сёння ідзе ў Сірыі. Мы аказваем і аказвалі гуманітарную падтрымку народу гэтай краіны, асабліва дзецям. Выпрацавана цэлая праграма іх аздараўлення ў Беларусі. У гэтым жніўні, дарэчы, кіраўнік дзяржавы асабіста сустракаўся з маленькімі сірыйцамі, якія адпачывалі і папраўлялі здароўе ў адукацыйна-аздараўленчым цэнтры «Зубраня» і аздараўленчым лагеры «Крынічка». Тады ж айчынныя СМІ абляцела навіна: беларускія хірургі выдалілі пухліну дзесяцігадовай сірыйскай дзяўчынцы. Рым Салем разам са сваімі таварышамі, якія пабывалі ў Палацы Незалежнасці і сустрэліся з кіраўніком нашай дзяржавы, прыехала на аздараўленне ў Беларусь. Падчас медыцынскага абследавання ў яе выпадкова знайшлі анкалагічнае захворванне. Апекуны дзяўчынкі згадзіліся на лячэнне.

— Словам, вы ведаеце пра нашу работу, — абагуліў Аляксандр Лукашэнка. — Яшчэ раз хачу падкрэсліць: мы заўсёды будзем у такім духу дзейнічаць, таму што гэта — сутнасць нашага народа.

Петэр Маўрэр у адказ заўважыў, што на працягу ўжо многіх гадоў паміж арганізацыяй, якую ён прадстаўляе, і Беларуссю падтрымліваюцца цудоўныя адносіны. «І зараз я тут для таго, каб падпісаць пагадненне аб дэлегацыі Міжнароднага Чырвонага Крыжа ў Беларусі і адкрыць пастаянную прысутнасць гэтай арганізацыі тут, у Мінску, у наступным годзе, — паведаміў прэзідэнт МКЧК. — Мы тут адчуваем сябе як дома. Беларускі народ мае доўгую гісторыю пакут. І людзі, і ўлады, і вы асабіста падтрымліваеце Міжнародны камітэт Чырвонага Крыжа ў сваёй рабоце. Мы гэта адчуваем».

Петэр Маўрэр канстатаваў, што свет стаў нашмат больш складаны і палярызаваны за апошні час. Гуманітарныя наступствы канфліктаў адчуваюцца ўсё больш востра. Ён прызнаўся, што сёння Міжнародны камітэт Чырвонага Крыжа як ніколі залежыць ад падтрымкі такіх краін, як Беларусь, — зацікаўленых ва ўрэгуляванні канфліктаў.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■ Энергетычная бяспека

# ПРАДУГЛЕДЗЕЦЬ ЗЕМЛЯТРУС І НАЙМАЦНЕЙШУЮ ПАВОДКУ

## Стрэс-тэсты пацвердзілі надзейнасць Беларускай АЭС

**Айчынная атамная электрастанцыя ўстойлівая да ўзнікнення надзвычайных сітуацый, падобных тым, што адбылася на АЭС «Фукусіма», паведаміла начальнік Дэпартамента па ядзернай і радыяцыйнай бяспецы МНС (Дзяржатамнагляд) Вольга ЛУГАЎСКАЯ.**

Стрэс-тэсты — гэта, па сутнасці, пазапланавая мэтавая праверка адносна ўстойлівасці атамнай электрастанцыі да экстрэмальных знешніх уздзеянняў: землятрусаў, затапленняў, складаных умоў надвор'я. Разглядалася ўстойлівасць да з'яў, якія гіпатэтычна магчымыя на тэрыторыі Беларусі: моцных вятроў і дажджоў, шквалаў, смерчаў, буйнога граду, пыльных бур, моцных завей, абледзянення, туману, засух, а таксама да камбінацый гэтых з'яў.

Дэпартамент цяпер публікуе нацыянальную справаздачу па выніках стрэс-тэстаў для атамнай электрастанцыі ў Астраўцы. Яго высновы даказваюць, што АЭС, якая будуецца на базе расійскага дызайну апошняга пакалення «3+», цалкам адпавядае самым высокім міжнародным стандартам бяспекі. А гэтыя стандарты, прынятыя пасля аварыі на АЭС «Фукусіма» ў 2011 годзе, былі распрацаваны для таго, каб гарантаваць бяспеку нават у выпадку адмовы асноўных сістэм або ў выніку знешніх уздзеянняў. Цяпер нацыянальная справаздача перададзена Еўрапейскай групе па наглядзе ў сферы ядзернай бяспекі і Еўракамісіі для міжнароднай экспертнай ацэнкі.

Вольга Лугаўская падкрэсліла, што бяспека — безумоўны прыярытэт для ўсіх краін, якія ўцягнуты ў будаўніцтва і эксплуатацыю атамных электрастанцый. У Беларусі таксама падзяляюць сучасныя міжнародныя падыходы і ўсведамляюць важнасць забеспячэння дастатковага ўзроўню бяспекі Беларускай АЭС. «Адзначаем, што такі ўзровень бяспекі вызначаны ў падрыхтаванай намі нацыянальнай справаздачы аб




стрэс-тэстах. Мы знаходзімся ў статусе краіны-пачаткоўца ў рэалізацыі ядзерна-энергетычнай праграмы, для нас правядзенне працэдуры стрэс-тэстаў з'яўляецца не толькі надзейным інструментам праверкі і пацвярджэння бяспекі АЭС, але і кропкай росту ў дачыненні да развіцця тэхнічных кампетэнцый, арганізацый тэхнічнай падтрымкі, якія прымалі ўдзел у падрыхтоўцы нацыянальнай справаздачы», — дадала Вольга Лугаўская.

Кіраўнік дэпартамента адзначае, што землятрус з'яўляецца адным з магчымых фактараў знешняга ўздзеяння, якія ацэньвалі беларускія эксперты. Па выніках комплекснага імавернаснага аналізу, максімальная інтэнсіўнасць землятрусу ў раёне пляцоўкі станцыі — 6 па шкале MSK (не блытаць са шкалой Рыхтэра), што вызначана ў якасці «праектнага землятрусу» для станцыі. Разам з тым рэактарныя ўстаноўкі спраектаваны такім чынам, каб выключыць верагоднасць аварыі і бяспечна вытрымаць нават вельмі малаверагодны землятрус інтэнсіўнасцю 8 па шкале 8 MSK (інтэнсіўнасць у 7 балаў вызначана для «максімальнага разліковага землятрусу» АЭС).

Што датычыцца магчымых затапленняў. Хоць паводкі ў раёне размяшчэння пляцоўкі АЭС немагчымыя (для гэтага вада павінна падняцца на 51,5 м вышэй за гістарычны максімум), станцыя вытрымае нават такі ўзровень затаплення. Аналіз і наступнае мадэляванне паказалі, што ў выпадку гіпатэтычнай паводкі і затаплення памяшканняў АЭС, якія размяшчаюцца ніжэй за ўзровень зямлі, пагроза для рэактара адсутнічае.

Нават у выпадку самых экстрэмальных умоў надвор'я (якія ўзнікаюць раз у 10 000 гадоў), такіх як павышэнне тэмпературы паветра да 50 градусаў, або смерч з хуткасцю да 62 м/с, або нават у выпадку камбінацыі гэтых двух катаклізмаў аварыі не здарыцца, бо меры бяспекі, прадугледжаныя для абароны ад іншых уздзеянняў (затапленне, землятрус), дастатковыя для самых экстрэмальных умоў надвор'я.

Беларусь добраахвотна прапанавала правесці ўсеабдымную ацэнку ядзернай бяспекі на аснове крытэрыяў ЕС, калі ў 2011 годзе далучылася да Сумеснай дэкларацыі па правядзенні ацэнкі рызыкі і бяспекі АЭС («стрэс-тэсты»).

У адпаведнасці з працэдурай правядзення стрэс-тэстаў, Беларуская АЭС выканала самаацэнку бяспекі і ў сакавіку 2017 года прадставіла справаздачу ў Дзяржатамнагляд. Дэпартамент арганізаваў правядзенне экспертызы бяспекі справаздачы, якую выконваў Аб'яднаны інстытут энергетычных і ядзерных даследаванняў «Сосны». Вынікі экспертызы сталі асновай для падрыхтоўкі нацыянальнага даклада аб стрэс-тэстах Беларускай АЭС.

Па словах начальніка Дзяржатамнагляда, ужо сфарміравана каманда еўрапейскіх экспертаў, якая будзе прымаць удзел у разглядзе нацыянальнага даклада па выніках стрэс-тэстаў Беларускай АЭС. Разгляд такога дакумента звычайна доўжыцца некалькі месяцаў. «Паводле папярэдняй дамоўленасці, у сакавіку мы чакаем прыезду еўрапейскіх экспертаў для правядзення абмеркаванняў, абмену думкамі і, магчыма, фармулявання прапаноў датычна нашага нацыянальнага даклада», — растлумачыла Вольга Лугаўская.

У адкрытым доступе даклад размешчаны на сайце Дзяржатамнагляда.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Трэнды

# Цана на нафту абнавіла двухгадовы максімум

**Кошт нафты Brent вырас да 62,81 долара за барэль. Цана на яе не падымалася да такога ўзроўню з 2015 года. Двухгадовы максімум абнавіла і WTI, яе барэль падаражэў да 55,94 долара.**

Эксперты звязваюць такі скачок цэн на «чорнае золата» з запускам маштабнай антыкарупцыйнай кампаніі ў Саудаўскай Аравіі. Напярэдадні яе караль Сальман бен Абдэль Азіз Аль Сауд абвясціў, што адказныя органы дзяржавы правядуць серыю затрыманняў абвінавачаных у фінансавых махінацыях і злоўжываннях уладай у каралеўстве. Пры гэтым манарх падкрэсліў неабходнасць выкараніць карупцыю і прыцягнуць да адказнасці карумпаваных асоб. Сфарміраваны 4 лістапада Вышэйшы камітэт па барацьбе з карупцыяй пастанавіў затрымаць 11 прынцаў з кіручай сям'і, а таксама некалькі дзясяткаў міністраў, як тых, што пайшлі ў адстаўку, так і членаў дзеючага Кабміна.

Шэраг аналітыкаў мяркуюць, што кошт нафты вырас таксама на фоне навін аб гібелі высокапастаўленых чыноўнікаў Саудаўскай Аравіі ў крушэнні верталёта. Як паведамлялася, інцыдэнт адбыўся паблізу горада Абха, што на паўднёвым захадзе краіны. Сярод загінулых знаходзіўся прынц Мансур бін Мукрына, бізнесмен, саветнік пры двары наследнага прынца Саудаўскай Аравіі, які мае пасаду міністра.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*


**Извещение о проведении первых и повторных открытых аукционов по продаже земельных участков в частную собственность**

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 47-20-56.

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка |
| --- |
| Лот №1. Земельный участок с кадастровым №221283703101000121, площадью 0,1493 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Куринский с/с, д. Задвинье, ул. Надречная, участок №2 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (река Западная Двина), охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 В. **Нач. цена:** 1 805,03 руб. **Задаток:** 180,51 руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY22AKBB36003140700920000000 ОАО «АСБ Беларусбанк» БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Куринский сельисполком). |
| **Дата, время и место проведения повторного аукциона:** 24.11.2017 в 15.00. по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатка и приема документов:** с 09.11.2017 с 8.30 по 23.11.2017 до 17.30 по адресу: г.Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30. Условия аукциона: получить в отделе архитектуры и строительства Витебского райисполкома в установленном порядке техническую документацию и разрешение на строительство жилого дома; приступить к занятию зем. участка в соответствии с целью и условиями его предоставления в течение 1 года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство капитального строения (здания, сооружения); осуществить строительство жилого дома в сроки, определенные ПСД; снять, сохранить и использовать плодородный слой почвы согласно ПСД. |

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка. Размер начальной цены и задатка |
| --- |
| Лот №1. Земельный участок с кадастровым №221287012101000901, площадью 0,1494 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Новкинский с/с, аг. Новка, ул. Вишневая, 7, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничений в использовании нет. **Нач. цена:** 11 620,97 руб. **Задаток:** 1 162,10 руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY85AKBB36003141001190000000 ОАО «АСБ Беларусбанк» БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Новкинский сельисполком) |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** 11.12.2017 в 16.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатка и приема документов:** с 09.11.2017 с 8.30 по 08.12.2017 до 17.30 по адресу: г.Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30. Условия аукциона: получить в установленном порядке разрешение Витебского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработать проект на строительство объекта в срок, не превышающий 2 лет; в течение 1 года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта приступить к занятию зем. участка в соответствии с целью и условиями его предоставления; осуществить строительство жилого дома в сроки, определенные ПСД; снять, сохранить и использовать плодородный слой почвы согласно ПСД. |

Аукционы проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462. Для участия в аукционе приглашаются граждане РБ, консолидированные участники (двое и более граждан РБ). **Для участия в аукционе** граждане РБ подают заявление об участии в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; консолидированными участниками – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт гражданина РБ, представители граждан, уполномоченные лица (представители) – документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные в установленном законодательством порядке. **Условия аукциона: победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за зем. участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; обратиться за гос. регистрацией права на зем. участок в двухмесячный срок со дня проведения аукциона (утверждения протокола о результатах аукциона). Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Назначение зем. участков в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: 1 09 02 – зем. участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по гос. регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем. участка. Конт. тел.: (0212) 47-20-56, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by


**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні члену Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па бюджэце і фінансах Сайганавай Таццяне Іванаўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

# СВЯТА Ў ФАРМАЦЕ «ЕЎРАБАЧАННЯ»

## Моладзь з абмежаванымі магчымасцямі паказала свае творчыя здольнасці

**У Дзятлаве прайшоў IX фестываль наведвальнікаў тэрытарыяльных аддзяленняў дзённага знаходжання «Калі мы разам — мы мацнейшыя».**



Фота Ірыны СТЫРНІК.

З кожным годам фестываль становіцца больш маштабны. Сёлета ў ім прынялі ўдзел больш за трыста чалавек з усіх рэгіёнаў Гродзеншчыны і выхаванцы Васілішкаўскага дома-інтэрната для дзяцей-інвалідаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

Мерапрыемства 2017 года прайшло ў новым фармаце «Еўрабачання». Кожны калектыў, а іх налічвалася больш за 20, паказаў творчасць той ці іншай краіны свету. Дзякуючы ўдзельнікам фестывалю гледачы пазнаёміліся з культурай, звычаямі, песнямі і танцамі не толькі еўрапейскіх краін, але і іншых кантынентаў. Напрыклад, ЗША, Венесуэлы, Афрыкі. Так, індыйскае вяселле з песнямі прадэманстравалі ўдзельнікі з Навагрудскага раёна, «бразільскі» карнавал — шчучынскія артысты. Са сцэны гучалі песні на розных мовах. Беларусь на імправізаваным «Еўрабачанні» прадставілі гаспадары фестывалю — наведвальнікі раённага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Яны выканалі танец пад песню «Жураўлі на Палессе ляцяць». Разам з маладымі інвалідамі на сцэну выходзілі выхаванцы дзіцячых садкоў.

— Мы ўпершыню зрабілі такі інклюзіўны нумар, — паведаміла **дырэктар Дзятлаўскага цэнтра Таццяна НІКІПОРЧЫК**, — лічу, што сумесная дзейнасць дапаможа адаптацыі інвалідаў, асабліва ў маладзёжным асяроддзі.

Арганізатары зазначылі, што для ўдзельнікаў гэтыя фестывалі вельмі важны. Яны рыхтуюцца да яго цэлы год — шыюць касцюмы, вучаць песні і танцы. Таму сёлетні фестываль быў надзвычай яскравы, дапамагалі не толькі дзяржаўныя структуры і арганізацыі, але і спонсары. Да мерапрыемства падключыліся і буйныя прадпрыемствы вобласці, гандлёвыя сеткі. Для ўсіх удзельнікаў было падрыхтавана па 7—8 падарункаў. Суправаджалі фестываль валанцёры БРСМ і Чырвонага Крыжа.

Трэба адзначыць, што ўдзельнікі падрыхтавалі не толькі канцэртныя нумары, але і зрабілі лялькі розных нацыянальнасцяў у адпаведных уборах. Лялечная выстава дэманстравалася падчас фестывалю.

— Усяго на Гродзеншчыне тэрытарыяльныя аддзяленні дзённага знаходжання наведваюць 670 чалавек, у вобласці функцыянуюць 170 працоўных майстэрняў і клубаў, — зазначыў **старшыня камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Гродзенскага аблвыканкама Анатоль ЗІМНАВОДА**. — Напрыклад, такія прыгожыя лялькі, якія прадстаўлены на выставе творчасці, можа зрабіць далёка не кожны майстар.

Кожная каманда атрымала дыпломы ўдзельнікаў IX абласнога фестывалю маладых людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Па словах Таццяны Нікіпорчык, многія наведвальнікі выказвалі падзяку за гэта мерапрыемства, бо пачыналі па-новаму ўспрымаць жыццё. Да гэтага іх падштурхнуў пазітыўны настрой маладых інвалідаў. Яны не толькі выконвалі свае нумары з добрымі ўсмешкамі, але і гатовы былі падзяліцца сваім настроем з усімі прысутнымі.

Наступны, X фестываль «Калі мы разам — мы мацнейшыя» збярэ ўдзельнікаў у будучым годзе ў Гродне. Свята будзе ладзіць Ленінскі раён абласнога цэнтра.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
*margo@zviazda.by*

# Пароды эпох Барока і Старажытнага Усходу

## Міжнародная выстава-паказ пародзістых коней «Восень-2017» прайшла ў сталіцы

**Гэта адзінае мерапрыемства ў Беларусі, якое сабрала пад адным дахам вялікую колькасць пародзістых коней — усяго каля паўсотні самых лепшых жывёл з нашай краіны і замежжа. Скакуны пазмагаліся за тытул чэмпіёнаў сярод цяжкавозаў, запражных, верхавых парод. Таксама адбылася і экспертыза коней. Упершыню сёлета прайшла спецыялізаваная выстава поні.**



Гледачоў чакала шоу-праграма з удзелам коней: тэатралізаваныя, акрабатычныя і цыркавыя нумары энтузіястаў з прыватных школ, а таксама заслужаных артыстаў цырка. Шоу амазонак, экстрым-казачае шоу, касцюміраваныя танцы, спаборніцтвы па канкуры, паказальныя выступленні — гэта ўсё чакала наведвальнікаў. Кожны ахвотны змог пракаціцца на кані, наведаць выставу фотаработ і карцін, паўдзельнічаць у розыгрышах падарункаў ад арганізатараў, пакарміць жывёл. Для самых маленькіх наведвальнікаў былі арганізаваныя катанні, бясплатная кантактная пляцоўка, майстар-класы.

**Марына БЕГУНКОВА.** *begunkova@zviazda.by*
**Фота аўтара.**

■ Прыемная навіна

# Гарантаванае месца для малых грамадзян

**У Жодзіне ўрачыста адкрыўся новы дзіцячы яслі-сад №7 на 230 месцаў з паэтычнай назвай «Сонейка». Яго адкрыццё прымеркавана да свята Кастрычніка. Дашкольную ўстанову ўзвялі работнікі будтрэста №35, кошт работ абышоўся ў 54,3 млн рублёў.**

Высока ацаніў якасць будаўніцтва і ўмовы для малых насельнікаў **намеснік старшыні Мінаблвыканкама Віктар СІРЭНКА:** «Прасторныя холы. Добрыя дваровыя пляцоўкі, усё скіравана на тое, каб дзеці сябе добра адчувалі, развіваліся».



У садку мелі вялікую патрэбу жыхары мікрараёна Лагойскі. Тут жыве шмат маладых сем'яў, якія выхоўваюць малых.

Нагадаем, 23 верасня ў Жодзіне быў адкрыты дзіцячы садок на базе былога дзіцячага дома. Сюды пайшлі 154 малыя наведвальнікі.

— З адкрыццём новай дашкольнай установы мы практычна вырашылі праблему з месцамі ў дзіцячых садках Жодзіна, — адзначыла **начальнік упраўлення адукацыі Мінаблвыканкама Галіна КАЗАК**. — Вельмі важна, што маем магчымасць прымаць тут і ясельную групу дзяцей з двух гадоў. Вядома, малыя гэтага ўзросту наведвалі іншыя дашкольныя ўстановы, але групы былі перагружаны. Цяпер жа захоўваецца нарматыў па напаўняльнасці. Важна і тое, што маці, не чакаючы заканчэння тэрміну па доглядзе малых, па жаданні могуць выйсці на работу. Дашкольная адукацыя ў нашай краіне ў прынцыпе не з'яўляецца абавязковай, ды яна вельмі запатрабавана бацькамі. Але гэта ўсё праходзіць нераўнамерна. У асобных раёнах сельскай мясцовасці мы закрываем садкі, паколькі мала дзяцей. У гарадах іншая сітуацыя.

Месяц таму адкрылі дзіцячы садок на 230 месцаў у Стоўбцах. Для гэтага рэгіёна таксама практычна вырашана праблема з уладкаваннем малых у дашкольныя ўстановы. Крыху складанейшая сітуацыя ў Мінскім раёне. У найбліжэйшы час тут прыступяць да будаўніцтва двух дзіцячых садкоў у Бараўлянскім сельсавеце. Хутка адкрыецца дашкольная ўстанова, якую ўзвёў прыватны інвестар у вёсцы Баравая. Гэтыя крокі дазволяць зняць праблему па ўладкаванні дзяцей ад трох гадоў.

Застаецца вострай праблема недахопу месцаў у дзіцячых садках Фаніпаля Дзяржынскага раёна, паколькі горад імкліва развіваецца, будуецца шмат жылля. Але і там ужо прыступаюць да будаўніцтва дашкольнай установы на 230 месцаў.

З 2011 па 2017 гады ў вобласці пабудавана 18 устаноў дашкольнай адукацыі больш як на 3000 месцаў. Акрамя таго, 10 аб'ектаў пасля рэканструкцыі перапрафіляваны пад дзіцячыя садкі.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by* ■

■ Нясумныя канікулы

# РАЗУМНІКІ І РАЗУМНІЦЫ ВЫЗНАЧЫЛІ НАЙЛЕПШЫХ

**У Мінску завяршыўся заключны этап алімпіяды школьнікаў Саюзнай дзяржавы «Расія і Беларусь: гістарычнае і духоўнае адзінства». Па суме набраных балаў у камандным заліку пераможцам стала зборная беларускай сталіцы, другое каманднае месца падзялілі каманды Яраслаўскай вобласці і Ліцэя БДУ, трэцяе месца — каманды Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай абласцей. Спецыяльны прыз аргкамітэта атрымала навучэнка гімназіі-каледжа мастацтваў Маладзечна Ксенія Шымановіч.**

Абсалютным жа пераможцам алімпіяды школьнікаў Саюзнай дзяржавы стаў расіянін — вучань сярэдняй агульнаадукацыйнай школы №37 з паглыбленым вывучэннем асобных прадметаў горада Выбарга Ленінградскай вобласці Дзяніс Пісарэнка. Яму дастаўся спецыяльны дыплом і прыз Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы.

У заключным этапе алімпіяды ўзялі ўдзел 186 навучэнцаў 10—11-х класаў з Беларусі і Расіі. Яго праграма прадугледжвала правядзенне двух абавязковых тураў (комплексную работу па рускай мове і літаратуры і напісанне сачынення) плюс творчы конкурс рытарычнага майстэрства і знаўцаў.

Палкапіцелі арганізатары і пра культурную праграму: старшакласнікі наведалі музей Вялікай Айчыннай вайны, Палац Незалежнасці, Нацыянальны мастацкі музей, Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік «Нясвіж». Сталі ўдзельнікамі тэматычных канцэртных праграм, вечароў дружбы, сустрэч з вядомымі пісьменнікамі. Разам з членамі журы прадстаўнікі камандаў пасадзілі алею Дружбы.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by* ■

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### У ЗША падлічылі выдаткі на ваенныя аперацыі на Блізкім Усходзе



Пачынаючы з 2001 года ЗША выдаткавалі $4,3 трыльёна на ваенныя аперацыі ў Іраку, Сірыі, Афганістане і Пакістане, а таксама на ўзмацненне нацыянальнай бяспекі і дапамогу ветэранам, а ў наступным фінансавым годзе гэтая сума можа ўзрасці да 5,6 трыльёна долараў. Аб гэтым гаворыцца ў даследаванні інстытута Уотсана Браўнаўскага ўніверсітэта. Яно ўлічвае не толькі адлічэнні амерыканскага міністэрства абароны, але і звязаныя з ваеннымі патрэбамі выдаткі Дзярждэпартамента, міністэрства па справах ветэранаў і органаў дзяржаўнай бяспекі. Такім чынам, ваенныя выдаткі ЗША абыйшліся кожнаму амерыканскаму падаткаплацельшчыку амаль у 23,4 тысячы долараў, падлічылі аўтары даследавання.

### Улады Саудаўскай Аравіі выключаць активы на 800 млрд долараў у абвінавачаных у карупцыі

Пра гэта паведамляе The Wall Street Journal. Па інфармацыі крыніц газеты, у мінулыя выхадныя было затрымана больш за 60 чалавек, у тым ліку прынцы, чыноўнікі і іншыя ўплывовыя саудаўцы. Затрыманых абвінавачваюць у адмыванні грошай, злоўжыванні ўладай, хабарніцтве, растраце дзяржсродкаў і вымагальніцтве грошай у чыноўнікаў. Цэнтральны банк Саудаўскай Аравіі замарозіў банкаўскія рахункі фігурантаў карупцыйнага скандалу. Канфіскаваныя актывы стануць уласнасцю дзяржавы, сцвярджае крыніца.

### У Фінляндыі мяркуюць зрабіць больш жорсткім закон аб тэрарызме

Працоўная група міністэрства юстыцыі Фінляндыі прапануе ўнесці папраўкі да закона аб тэрарызме, пашырыўшы трактоўку злачынстваў, якія маюць тэрарыстычны характар, а таксама даўшы вялікія паўнамоцтвы спецслужбам з верасня 2018 года, гаворыцца ў паведамленні на сайце міністэрства. «Працоўная група прапануе прыраўняць да тэрарызму злачынствы, якія нясуць сур'ёзны эканамічны ўрон, учыненыя з дапамогай камп'ютарных і электронных сістэм», — адзначаецца ў паведамленні. Згодна з дакладам, прапануецца караць людзей, якія не здзейснілі злачынстваў, але рыхтаваліся да іх.

### Twitter падвоіў ліміт да 280 знакаў



Сацыяльная сетка Twitter абвясціла аб тым, што павялічвае ліміт знакаў у паведамленнях са 140 да 280. Пра гэта гаворыцца ў афіцыйным блогу кампаніі. Эксперымент па падваенні колькасці сімвалаў стартаваў у верасні ў адказ на скаргі карыстальнікаў на нязручнасць вымушаных скарачэнняў. Высветлілася, што абмежаванне ў 140 сімвалаў перавысілі 9% твітаў, за новыя рамкі будзе выходзіць толькі 1% паведамленняў на англійскай мове. Эксперымент не распаўсюджваўся на мовы з іерагліфічным пісьмом — такія сімвалы нясуць у сабе ўдвая больш інфармацыі, чым у лацінцы. Так што ў японскім, карэйскім і кітайскім «Твітары» даўжыня паведамленняў застанецца ранейшая.

# ВЫРАШЫЦЬ ЖЫЛЛЁВАЕ ПЫТАННЕ І НАВАТ НАЛАДЗІЦЬ ЖЫЦЦЁ

## Домікі з сучасную кухню і тысячагадовы вянок

Калі вярнуцца ў часе на адзінаццаць стагоддзяў таму, то пачынаць экскурсію варта было б за 16 кіламетраў ад мяжы горада. Бо менавіта там знаходзілася месца, якое згадваецца ў «Аповесці мінулых гадоў» як Менск. У Беларусі назвы гарадоў, якія заканчваюцца на -ск, традыцыйна паходзілі ад назваў найбліжэйшых рэчак: Полацк — Палата, Віцебск — Віцьба. Аднак на тэрыторыі сучаснага горада нічога падобнага не было: Пярэспа, Лоша, Няміга, Свіслач... Рэчка Мена «знайшлася» паблізу вёскі Гарадзішча, якая цяпер адносіцца да Шчомысліцкага сельсавета. Падчас раскопак там знаходзілі толькі рэчы, выробленыя да XII стагоддзя. Супастаўшы гэтыя факты, навукоўцы прыйшлі да высновы, што, з верагоднасцю больш за 90%, менавіта там жылі першыя мінчукі, якія потым былі вымушаныя пераехаць.

Прычына была якраз у падзеях, якія апісваліся ў летапісе. У 1067 годзе князі Яраславічы пайшлі вайной на полацкага князя, якім тады быў Усяслаў Чарадзей. Лічылася, што ён нарадзіўся ад чаравання, ці, інакш кажучы, вядзьмарства, і ў яго на целе была нейкая загана, якую ён усё жыццё хаваў. Хутчэй за ўсё, гаворка ішла аб буйной радзімай пляме. Але яго сучаснікі ўсур'ёз былі ўпэўненыя, што ён можа абарачацца ў арла, вепрука, ваўка, а таксама знаходзіцца ў розных месцах адначасова. Тым не менш гэта яму не дапамагло: бітву з Яраславічамі ён прайграў. Менск быў цалкам разбураны, таму мясцовыя жыхары, хто застаўся ў жывых, сабралі пажыткі і перайшлі на іншае месца.

Вось зараз самы час згадаць пра раён сучаснай Нямігі, таму што накіравалася яны туды. Месца было абрана нездарма. Вядомы факт, што самая старая, 800-гадовая, вуліца горада паўтарае рэчышча ракі Нямігі, якая раней упадала ў Свіслач. Дарэчы, сама Свіслач была шырокая, суднаходная, у ёй нават лавілі фарэль, а на беразе размяшчаўся прыстойны рыбны рынак. Паблізу, з боку Петрапаўлаўскай царквы і да Палаца спорту, цякла яшчэ адна рака, якая ўпадала ў Свіслач. Такім чынам утварыўся ідэальны, абаронены з усіх бакоў вадой участак, нібы адмыслова прызначаны для будаўніцтва горада. Гарадскі вал умацавалі бярвёнамі — гэта было настолькі саліднае і моцнае збудаванне, што яго некалькі разоў спрабавалі ўзяць аблогай і не змаглі. На ўмацаванне сышло лесу аб'ёмам з тры футбольныя палі. Вонкавыя сцены былі практычна вертыкальныя — адным словам, рабілі ад душы і на стагоддзі.

Забудова ўнутры была хаатычная. Домікі памерам ўсяго чатыры на чатыры, а то і тры на тры метры. Па вуліцы сцялілася драўляная маставая, зверху на якую клалі новую, калі па старой немагчыма было прайсці, — усе адкіды ішлі на вуліцу. Ужо пры Глебе Менскім у XII стагоддзі пачалі будаваць першы мураваны будынак — царкву. Але ўзвялі толькі два метры ў вышыню і з невядомай прычыны закінулі работу. Дарэчы, рэшткі пабудоў захаваліся да гэтага часу — і царква, і само гарадзішча знаходзяцца пад будынкам цэнтра фізічнага выхавання. Калі будавалі метро ў 1984 годзе, на тэрыторыі гэтай царквы знайшлі 21 пахаванне. Адно з іх было шаснаццацігадовай дзяўчыны. Дзякуючы багністай глебе, яно вельмі добра захавалася: сукенка, пацеркі, скураныя тэпцікі, а на косках навукоўцы паспелі нават убачыць, пакуль ён не рассыпаўся ў пыл, вянок з белых кветак.



Так выглядала папярэдняя мінская ратуша.

## Ратуша, якая растварылася ў прасторы...

Паколькі горад стаяў на скрыжаванні двух асноўных гандлёвых шляхоў і аднаго дапаможнага, да з'яўлення чыгункі менавіта гандаль быў асноўным заняткам мясцовых жыхароў. Спачатку горад рос у бок Траецкага і Ракаўскага прадмесцяў, за якімі былі Татарскія агароды. На месцы цяперашняй гасцініцы «Юбілейная» стаяла мячэць, толькі нядаўна яе адбудавалі нанова, але ўжо на вуліцы Грыбаедава. Пазней Мінск пачаў развівацца ў бок сучаснага праспекта Незалежнасці.

Адным з самых прыгожых месцаў у горадзе была Ратушная плошча. У 1499 годзе Мінск атрымаў магдэбургскае права. Да гэтага ўсімі землямі кіравалі альбо буйныя феадалы, як, напрыклад, Радзівілы, альбо вялікі князь. З наданнем магдэбургскага права гараджане атрымалі магчымасць самакіравання. Сімвалам гэтага права станавілася ратуша, дарэчы, цяперашняя для Мінска ўжо трэцяя: першая згарэла, а другую разбурылі. У ратушы засядалі лаўнікі — члены крымінальнага суда — і рада. Гэта быў агульны савет, які, па сутнасці, кіраваў усімі гарадскімі справамі. Вялікі князь у гэтым нія не ўдзельнічаў, а толькі атрымліваў падаці. Пры гэтым сачыць за тым, што адбываецца, яму было неабходна, таму ён прызначаў свайго пасланца — войта, які кантраляваў жыццё горада. Буйная скульптура перад ратушай увасабляе менавіта яго. Існуе нават нядаўна прыдуманае гарадское павер'е, што, калі патрэбна кватэра ў Мінску, трэба пацерці ключ у руках у войта.

Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай будынак занялі імперскія ўлады. Аднак ён занадта нагадваў пра былыя вольнасці, таму ў 1851 годзе было прынята валявое рашэнне, якое асабіста падпісаў імператар Мікалай I, аб зносе мінскай ратушы. Фармулёўка была такая: замінае маршыраваць салдатам на плацы. У горадзе аб'явілі, кажучы сучаснай мовай, тэндар на тое, каб яе разабраць. Ён праходзіў шэсць гадоў, у горадзе было 30 будаўнічых арганізацый, але ніхто не хацеў брацца за гэтую работу. Тады ў 1857 годзе з гэтай мэтай прыгналі зняволеных з Пішчалаўскага замка.



Воблік Верхняга горада цяпер.

Аднак ратуша не знікла бясследна. Бляха з даху пайшла на выраб 1,5 тысячы шыльдаў з назвамі вуліц і нумарамі дамоў. З драўляных перакрыццяў зрабілі лавачкі для гарадскога саду. Цэглай выслалі маставую. Так яна засталася ў горадзе, не прыцягваючы да сябе ўвагі. Дарэчы, лічыцца, што цяперашнюю ратушу не пабудавалі нанова, а аднавілі, таму што неразбураным застався падмуркі. Яна вельмі падобная да сваёй папярэдніцы.

Экіпаж з конямі таксама апынуўся побач з ратушай невыпадкова — раней тут знаходзілася біржа, дзе іх можна было ўзяць напракат, каб пакатаць якую-небудзь прыгажуню. Дарэчы, аб гэтай скульптуры таксама ўжо ходзіць легенда. У аднаго з коней вушы павернуты ў іншы бок. Дык вось, калі ў вас у жыцці нешта ідзе не так, то варта іх пацерці і ўсё павінна наладзіцца.

Аўтар кампазіцыі, напэўна, самы «мінскі» з усіх скульптараў — Уладзімір Жбанаў. Ён з сям'і ваенных, служыў у Афганістане, калі вярнуўся, займаўся толькі ваеннай тэматыкай. Да адной лёсавызначальнай сваркі з жонкай, пасля якой ён адлюстраваў яе не ў самым прывабным выглядзе. Дарэчы, той вобраз лёг у аснову «Незнаёмкі», якая ўсталявана ў Міхайлаўскім скверы.

## Немец-партызан і трагічная ёлка

І ўсё ж Ратушная плошча — гэта месца, якое вядома не толькі вясёлымі гісторыямі. У гады вайны паблізу размяшчалася СД. Цяпер на гэтым будынку вісіць мемарыяльная дошка, і прысвечана яна... немцу. Фрыц Паўль Шменкель — адзіны з немцаў, хто быў узнагароджаны званнем Героя Савецкага Саюза. Ён быў антыфашыстам, але трапіў у нямецкую армію, і ўсё ж як толькі разам з войскам перайшоў мяжу, адправіўся шукаць партызанскі атрад. Вядома, партызаны спачатку не хацелі верыць у яго добрыя намеры і нават збіраліся расстраляць ворага, але Шменкелю ўдалося іх пераканаць. Тым не менш зброю ў рукі яму не давалі, пакуль ён сам не адбіў для сябе ў баі кулямёт.

Паколькі ён быў носьбітам мовы і ў яго была нямецкая форма, ён мог лёгка маскіравацца. Зайсці ў штаб і вынесці адтуль каштоўныя паперы або скрасці абоз з харчаваннем — такія выпадкі здараліся ў практыцы адчайнага немца. За яго галаву прызначылі ўзнагароду ў 25 тысяч марак, і ў 1944 годзе яго арыштавалі і расстралялі. Ужо ў 1960-я яго заслугі былі ацэненыя, і Фрыц Шменкель пасмяротна атрымаў адно з самых ганаровых у СССР званняў.

Яшчэ адна з цёмных старонак Ратушнай плошчы звязаная з Гасцінным дваром. Дарэчы, такую назву ён атрымаў ад слова, якім у даўніну называлі купцоў — госці.

1 студзеня 1946 года было вырашана зладзіць ёлку для дзяцей і моладзі. Электрычнасці не было, таму гарэлі свечкі. У памяшканні, упрыгожаным паперай і ватай, практычна ў момант пасля пачатку свята заняўся пажар. Дзеці сталі кідацца па будынку, выскоквалі з вокнаў... У выніку загінула каля ста чалавек. Абвінавацілі ва ўсім арганізатара, але ў яго самога ў гэтым пажары загінула дачка, таму яго не пакаралі, а справу на доўгі час засакрэцілі. Толькі на Вайсковых могілках усталявалі невялікі помнік у памяць ахвяр.

У нашы дні Ратушная плошча па праве асацыюецца з радаснымі падзеямі — чаго вартыя толькі дні нацыянальных культур, якія ў цёплую пару года праводзяцца тут практычна кожныя выхадныя. А джазавыя вечары, а «Пешеходка»... Да таго ж, калі верыць гарадскім легендам, то можна не толькі музыку паслухаць, але і вырашыць многія свае жыццёвыя праблемы.

**Дар'я КАСКО.**
*kasko@zviazda.by*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# ПАЎСТАННЕ МАШЫН

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Але што адбудзецца, калі ў выніку акажацца не патрэбны чалавек? Калі тэндэнцыя працягне сваё развіццё, то ці не забяруць робаты не толькі працу але і ўладу ў чалавека?

Магчыма да сістэмы «Скайнэт» з кінафільма «Тэрмінатар» нам яшчэ далёка, але эксперты сыходзяцца ў меркаванні, што любую работу, якую можна разбіць на алгарытмы, машына зможа выконваць больш эфектыўна. **Прадстаўнік Forbes Адзі ГАСКЕЛ** выказаў упэўненасць, што 85% працоўных месцаў у галінах, звязаных з тэхналогіямі, зараз знаходзяцца ў зоне рызыкі. Стварэнне штучных нейронных сетак для прагназавання нерацыянальных паводзінаў людзей, беспілотных аўтамабіляў на вуліцах «разумных гарадоў» у найбліжэйшай будучыні павінны істотна спрасціць наша жыццё. Аднак **дырэктар Цэнтра развіцця кампетэнцый па даследаванні даных блока «Рызыкі» «Ашчадбанка» (Расія) Максім ЯРОМЕНКА** задаўся пытаннем аб тым, хто будзе несці адказнасць за прынятыя робатамі рашэнні.



Яшчэ адно цікавае назіранне заключаецца ў тым, што чалавецтва ўступае ў эру аўтаматызацыі творчых прафесій. Пра гэта расказаў **заснавальнік сэрвісу PressFeed Канстанцін БАЧАРСКІ.** Разам з тым, ён супакоіў: ньюсмейкеры не знікнуць. Толькі частка іх работы, якая звязана са зборам інфармацыі, напісаннем простых нататак аб фінансах, надвор'і, сітуацыі на дарогах, будзе цалкам аўтаматызавана. Журналісту застанецца тое, што звязана з творчасцю і расстаноўкай дакладных акцэнтаў. З рупара ён павінен стаць аналітыкам. Эксперты заклікалі не губляць пільнасць і здольнасць да крытычнага мыслення. На іх думку, робаты не забяруць працоўныя месцы, але прымусяць чалавека змяніць свой падыход да выканання задач. Краіна, якая будзе лідзіраваць у развіцці штучнага інтэлекту, будзе валодаць светам. Для чалавецтва важна адказаць на новы выклік.

### ХТО ЗНІКНЕ?

Уплыў тэхнічнага прагрэсу, безумоўна, прымусіць памяняць стаўленне да працы. Неўзабаве некаторыя прафесіі калі не знікнуць, то зменяцца. Пакуль вы чытаеце гэты артыкул, недзе ў Карэі штучны інтэлект піша нататкі пра спорт. У кожным жарце ёсць доля жарту, але гумар пра робатаў становіцца ўсё менш смешны. Так на будучай зімовай Алімпіядзе ў Пхёнчхане карэйцы збіраюцца моцна пацясніць ньюсмейкераў праграмамі.

У спісе найбольш папулярных прафесій, якія знаходзяцца ў зоне рызыкі з-за тэхнічнага прагрэсу, часта фігуруе журналіст. Так, напрыклад, усім вядомая кампанія Google фінансуе праект Urbs Media брытанскага медыяхолдынга Press Association кругленькай сумай (больш за 700 тысяч еўра), з мэтай развіць лічбавую журналістыку ў Еўропе. Яна павінна дапамагчы аптымізаваць працу робажурналістаў у пошуку інфармацыі мясцовага значэння. Акрамя генерацыі кароткіх нататак, штучны інтэлект будзе будаваць графікі і падбіраць відэа і малюнкі да вялікіх матэрыялаў. Агенцтва плануе працаваць па новай схеме ўжо з пачатку 2018 года. Згодна з інфармацыяй аналітыкаў з Оксфарда, прафесія журналіста з 8%-най рызыкай можа знікнуць у наступныя 20 гадоў.

Такі ж лёс можа спасцігнуць і тых, хто заняты ў масавай серыйнай вытворчасці. З-за развіцця тэхналогій 3D-друку хутка машынная праца стане больш таннай і больш эфектыўнай, чым гэта робіць чалавек.

Як часта вы карыстаецеся паслугамі турагентаў? Магчыма, людзі старэйшага пакалення ўсё яшчэ заказваюць пуцёўкі ў агенцтвах. Аднак з развіццём анлайн-пакупак неабходнасць у пасрэдніках адпадае. Любы чалавек здольны праз смартфон знайсці сабе рэйс, забраніраваць гатэль і даведацца пра абстаноўку на пляжы ў любым пункце свету.

Для перакладчыкаў таксама набліжаюцца цёмныя часы. Людзі сёння ўсё часцей вымушаны ведаць дзве і больш моў, каб працаваць, мець зносіны, атрымліваць інфармацыю. Тэхнічны прагрэс таксама не стаіць на месцы: ужо ёсць праграмы для смартфонаў, якія дазваляюць аналізаваць вусную мову замежнага суразмоўцы і пераводзіць яе ў друкаваны тэкст на многіх мовах.

Дрэнныя навіны для таксістаў і кіроўцаў. Google ужо некалькі гадоў тэстуе сістэму беспілотнага кіравання аўтамабілямі. Услед за каліфарнійскай карпарацыяй даследаванні ў гэтай галіне пачалі Toyota, Volvo, Tesla. Штодня сотні машын без пілотаў курсіруюць па трасах.

Ну і вядома, паштальёны. Вы ўсё яшчэ пасылаеце лісты або грошы ў канвертах? Сумняваюся... Ды і пасылкі сёння дастаўляюць ад прадаўца адразу да парога спажыўца. Сёлета першыя паштовыя квадракоптары прайшлі паспяховыя выпрабаванні ў ЗША, Аўстраліі, Сінгапуры і Швейцарыі. Машыны навучыліся лётаць, а паштальён — не.

Гэта далёка не поўны спіс прафесій, якія будуць адчуваць цяжкасці з працаўладкаваннем людзей у наступныя 10—20 гадоў. У цэлым можна з упэўненасцю сказаць: рынак працы ўжо ніколі не будзе ранейшым.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
9 ЛІСТАПАДА 2017 г.
ЧАЦВЕР
№21 (15828)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

## Ларыса ГРЫБАЛЁВА:

# «У мяне заўсёды ёсць месца святу»



**Яна — папулярная спявачка, актрыса і тэлевядучая, распяхова бізнес-лэдзі, ідэальная мама і жонка. Гэты чалавек не ведае, што значыць здавацца. У чым тут сакрэт? Нам удалося пагаварыць з Ларысай ГРЫБАЛЁВАЙ і высветліць, у як у яе атрымліваецца заставацца «на вышыні».**

***— Кім у дзяцінстве хацелі стаць? Не артысткай?***

— Ведаеце, ніколі не думала, што стану тым, кім з'яўляюся цяпер. Я нават не ведала, што гэтым можна зарабляць. Заўсёды хацела стаць настаўніцай пачатковых класаў. Дарэчы, у мяне ёсць педагагічная адукацыя. Але, як бачыце, лёс распарадзіўся інакш.

***— А як тады трапілі на вялікую сцэну?***

— Я заўсёды любіла яе, але ніколі не думала, што гэта можа быць прафесіяй. Мяне пайсці на конкурс угаварыў мой куратар, кампазітар і кіраўнік вакальнай студыі «Шанц» пры Віцебскім педінстытуце Валерый Антонавіч Дамарацкі. Гэта быў конкурс маладых выканаўцаў «Маладзечна-94», які арганізоўваў Нацыянальны канцэртны аркестр Беларусі пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга. Я заняла другое месца, і мяне Міхаіл Якаўлевіч запрасіў на работу.

***— Калі і як зразумелі, што сталі вядомай? Хто дапамагаў і падтрымліваў на творчым шляху?***

— Сваю вядомасць адчула, калі стала вядучай праграмы «Усё нармальна, мама». На той момант я жыла ў інтэрнаце, і ў пакой сталі прыходзіць людзі, каб проста паглядзець на мяне. Прыходзілі нават ноччу. Для мяне ўсё гэта было вельмі нязвыкла. А на гэтым шляху мяне заўсёды падтрымлівала сям'я і творчыя сябры — Ягор Хрусталёў, Валодзя Максімкаў, які нават стаў маім хросным сынам. А таксама мяне падтрымлівалі Міхаіл Якаўлевіч і Валерый Антонавіч.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Служыць навуцы

# НАВОШТА РАТАВАЛЬНІКУ ПРАБІРКА?

## Малады супрацоўнік МНС прыдумаў, як зрабіць тканіну вогнеўстойлівай

**Уявіце, што падчас рамантычнай вячэры запаленая свечка ўпала на канапу і... нічога не здарылася. У сэнсе абіўка не загарэлася, мэбля ў поўным парадку. Фантастыка, скажаце? Ва Універсітэце грамадзянскай абароны МНС вас могуць запэўніць, што не. Старшы інспектар сектара міжнароднага супрацоўніцтва навучальнай установы Аляксандр ЛУК'ЯНАЎ разам з калегамі распрацаваў састаў, які робіць тканіны вогнеўстойлівымі.**


Каб вынайсці састаў, давялося правесці шмат гадзін у лабараторыі.

З выбарам прафесіі хлопец вызначыўся, можна сказаць, са школьнай парты. Яго бацька 20 гадоў праслужыў у МНС, а сам Аляксандр з шостага класа займаўся пажарным спортам. Успамінае, што напачатку ўсё давалася з цяжкасцю, але было вельмі цікава. Хлопец ездзіў на міжнародныя спаборніцтвы ў Польшчу, Літву, атрымаў званне кандыдата ў майстры спорту. І, што дзіўна, паспяваў добра вучыцца. Універсітэт Аляксандр скончыў з дыпломам з адзнакай. Поспехі ў навучанні і паспрыялі таму, што, калі выбар стаў паміж спортам і навукай, ён выбраў апошняе. Хоць школьнікам ніколі не думаў, што будзе мець справу з прабіркамі.

Пасля магістратуры малады чалавек працаваў выкладчыкам — вёў тактыку тушэння пажараў і правядзення выратавальных работ. У навуцы ён даследуе тэму вогнеабароны. Ідэю навуковай распрацоўкі падказала само жыццё. Па статыстыцы, каля 90 працэнтаў пажараў адбываецца ў жылым сектары, у памяшканнях з пастаянным ці часовым знаходжаннем людзей. Гэта праблема практычна ўсіх краін. Калі нізкакаларыйная крыніца ўзгарання (непатушаная цыгарэта, запалка) трапляе на паверхню матэрыялаў, загараецца спачатку ў адным месцы, а потым агонь распаўсюджваецца. Каб не дапусціць пажару, гэты ачаг трэба лакалізаваць. Як? Зрабіць так, каб абіўка канапы ці дыван не загараліся! Для гэтага іх можна апырскваць на вытворчасці спецыяльным саставам.

— Наша задача — надаць поліэфірным матэрыялам пастаянную вогнеўстойлівасць. Важна, каб састаў, якім будзе апрацоўвацца тканіна, не вымываўся. Таму яго трэба ўкараніць на ўзроўні малекул. Састаў мае неарганічную прыроду, а значыць, нетаксічны. І неалергенны: нават калі трапіць на скуру ў канцэнтраваным выглядзе, ніякай шкоды не будзе, — расказвае Аляксандр.

*(Заканчэнне на 5-й стар. «ЧЗ».)*

Па парыве душы

# ДАПАМАГЧЫ ЎСМІХНУЦЦА

## Бальнічныя клоўны вяртаюць да жыцця хворых дзетак і іх бацькоў

**Яна — вельмі прывабная. Яна — вельмі разумная. Яна — вельмі сур'ёзная і строгая настаўніца замежнай мовы смалявіцкай гімназіі. Для калег і вучняў — Яна Віталеўна РАПІНЧУК, нягледзячы на тое, што вельмі маладая і яшчэ знаходзіцца ў статусе маладога спецыяліста: пасля заканчэння Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта працуе толькі другі год.**

**Але не меней за два разы на месяц Яна кардынальна мяняе сваё аблічча: робіць легкадумную прычоску, прыбіраецца ў яркі смешны касцюм і начэплівае на твар... гарэзны чырвоны нос. Так дзяўчына ператвараецца ў клоўна. Калі быць больш дакладнай — у бальнічнага клоўна Фібі з маладзёжнага дабрачыннага грамадскага аб'яднання «Бальнічныя клоўны «Funny nose»...**

***— Неабходнасць бальнічных клоўнаў могуць па-сапраўднаму ацаніць, напэўна, толькі тыя дарослыя, дзеці якіх доўга знаходзяцца ў бальніцах, ды яшчэ самі малыя... Тое, што гэты рух з'явіўся ў нашай краіне, выдатна! Але як бальнічныя клоўны ўвайшлі менавіта ў тваё жыццё?*** — спыталі мы ў Яны.

— Маім глыбокім перакананнем заўсёды было тое, што чалавек не павінен марна праждываць сваё жыццё. Ён мусіць прыносіць карысць! Зрабіць свет лепшым мы здолеем толькі тады, калі пачнём з сябе. Гэтым я і займаюся — імкнуся працаваць над сабою і быць карысны.

Ужо трэці год з'яўляюся валанцёрам Мінскага ўніверсітэта трэцяга ўзросту: на грамадскіх пачатках выкладаю іспанскую мову пенсіянерам. Яшчэ ў студэнцкія гады ўдзельнічала ў некалькіх дабрачынных праектах: была суправаджальніцай дзіцяці-аўтыста, лідарам міжнароднага дзіцячага лінгвістычнага лагера «Fantasy Camp»... Іншымі словамі, мне заўсёды падабалася творчасць, стасункі з людзьмі. Падабалася дапамагаць ім. Гэта і прывяло мяне ў бальнічную клаўнаду.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*


Бальнічныя клоўны.

Цікавы досвед

# ШКОЛЬНАЯ ДЭМАКРАТЫЯ ПА-ЧЭШСКУ

## Адзін дзень весялосці — супраць ста дзён цяжкай працы...

**Дырэктар пражскай базавай школы «Вратыслаўска», доктар педагагічных навук Іржы ТРУНДА лічыць, што школа — гэта не толькі чэшская мова, матэматыка, фізіка і гісторыя... Варта выйсці за яе дзверы, каб у гэтым пераканацца. Як рыхтуюць школьнікаў у Чэхіі да дарослага жыцця, якія кампетэнцыі і навыкі ў іх развіваюць, даведаліся беларускія педагогі, якія паўдзельнічалі ў адукацыйнай вандроўцы ў гэту краіну.**

### Парламент галасуе за... піжамы

Горад Печкі — хоць і невялікі, па нашых мерках, населены пункт з колькасцю насельніцтва 4,5 тысячы чалавек, тым не менш у базавай школе тут навучаюцца 650 вучняў (праўда, у Чэхіі школьнікаў называюць студэнтамі). Сюды з'язджаюцца дзеці з усяго наваколля. Староста мястэчка ўпэўнены, што максімальнае запаўненне школы сведчыць пра яе запатрабаванасць і высокую якасць адукацыі, якую тут даюць. Між іншым, званок для ўсіх школьнікаў звініць у 7.45. І дзеці на ўрокі не спазняюцца.

Трэба растлумачыць, што базавая школа ў Чэхіі падзелена на дзве ступені: першую (1—5 класы) і другую (6—9 класы), пасля праходжання якіх можна працягнуць навучанне ў сярэдняй школе (аналаг нашых каледжаў), у сярэднім спецыяльным вучылішчы, дзе падлеткі атрымліваюць прафесію, або ў чатырохгадовай гімназіі (толькі на падставе здадзеных экзаменаў). Такім чынам, вучоба можа зацягнуцца для школяроў на 13 гадоў, хоць абавязковым у Чэхіі з'яўляецца толькі дзевяцігадовае навучанне. Навучальны год доўжыцца з 1 верасня да 30 чэрвеня з перапынкамі на асенні, зімовы і вясенні канікулы.

Для дзяцей, якія праяўляюць схільнасці да пэўных навук (дакладных ці гуманітарных), ёсць магчымасць паступлення ў васьмігадовую гімназію пасля пятага класа ці ў шасцігадовую — пасля сёмага. Але адбор ажыццяўляецца выключна на конкурснай аснове пасля здачы экзаменаў па чэшскай мове, матэматыцы і замежнай мове. Гімназічная адукацыя карыстаецца вялікім попытам у бацькоў. Гэта прэстыжныя навучальныя ўстановы, вучні якіх нацэлены на паступленне ў ВНУ. Таму і конкурсы ў іх высокія.

Базавая школа ў Печках — без перабольшвання, эпіцэнтр грамадскага жыцця ў сваім рэгіёне. Вельмі шмат увагі тут надаецца рабоце школьнага парламента. Кожны клас дэлегуе ў яго двух сваіх прадстаўнікоў на падставе праведзеных выбараў. Курыруе работу парламента **настаўніца гісторыі Ева ЗАЙЦАВА.**

— Тым вучням, якія не былі абраныя, але цікавяцца работай парламента, мы дазваляем прыходзіць на яго пасяджэнні, але без права галасаваць. Дзецям у школе павінна быць камфортна, таму мы заўсёды ўважліва да іх прыслухоўваемся. Так, па іх ініцыятыве у нас прайшоў дзень... піжам, калі і вучні, і настаўнікі прыйшлі ў школу ў адзенні для сну. У мяне ёсць фатаграфія ў піжаме — я была ў ёй проста прыгажуня! Праўда, маці, калі ўбачыла, як мой муж (дырэктар школы) збіраецца ісці ў піжаме на работу, сказала, што, калі яго сустрэнуць паліцэйскія, ён больш не будзе дырэктарам, — смяецца пані Ева. — Некалькі разоў за навучальны год мы арганізуем так званыя вясёлыя дні, напрыклад, калі дзяўчаткі апранаюцца як хлопчыкі, і наадварот. Ці дні самакіравання, калі настаўнікі замест сваіх вучняў садзяцца за парту. За актыўны ўдзел у такіх агульнашкольных мерапрыемствах дзеці атрымліваюць своеасаблівыя фанты. Яны даюць ім магчымасць «адкупіцца», напрыклад, калі вучань не зрабіў хатняе заданне ці калі настаўнік хоча паведаміць не вельмі прыемную інфармацыю яго бацькам або выставіць адзнаку, якая не задавальняе школьніка. **Мы лічым, што моманты, калі нашы вучні — шчаслівыя, вельмі і вельмі важныя: яны будуць успрымаць школу пазітыўна і ўдзельнічаць у чаканні наступнага свята. Адзін дзень весялосці — супраць ста дзён цяжкай працы...**



На ўроку ў першым класе ў Печках.

Школа некалькі гадоў супрацоўнічае з ЮНІСЕФ, дапамагае афрыканскім дзецям. Вучні сваімі рукамі робяць лялькі, якія потым прадаюцца на кірмашы. Дарослыя ведаюць, што, набываючы цацку, яны ахвяруюць свае грошы на добрую справу. Але да продажу лялек дзеці не прыцягваюцца, каб не мець дачынення да грошай, — гэта робяць прадстаўнікі ЮНІСЕФ. Таксама ў школе збіраюцца пластыкавыя коркі ад бутэлек, а грошы ад іх рэалізацыі накіроўваюцца жанчыне, якая выхоўвае цяжка хворае дзіця.

Найбольш актыўныя члены школьнага парламента ў канцы навучальнага года заахвочваюцца. Напрыклад, летась яны ездзілі ў Прагу на экскурсію ў сапраўдны парламент.

### «Афрыканы» для Афрыкі і не толькі

Дзейнічае школьны парламент на выбарнай аснове і ў базавай школе «Вратыслаўска» ў Празе.

— Па панядзелках усе вучацца з дзевяці гадзін, таму што ў восем гадзін збіраецца школьны парламент, — расказвае **намеснік дырэктара школы, настаўнік гісторыі і чэшскай мовы Павел МАРЦІНОЎСКІ.** — Звычайна першы ўрок у пачатковай школе пачынаецца ў 9 гадзін, а вучні на другой ступені вучацца з 8 гадзін. Група падоўжанага дня працуе з сямі раніцы і да паловы шостай вечара. Як правіла, вучні самі вырашаюць, у якіх праектах яны хацелі б узяць удзел. Так, летась школьнікі даведаліся, што адна з грамадскіх арганізацый займаецца дапамогай бедным дзецям. Умовай было падрыхтаваць падарунак, які б умясціўся ў каробку з-пад абутку. Дзеці ўсё вельмі прыгожа ўпакавалі. Яшчэ адзін праект — «Афрыканы для Афрыкі». Афрыканы — гэта назва кветкі. Вучні атрымліваюць ад грамадскай арганізацыі насенне кветкі, саджаюць яго дома ў гаршчок, паліваюць, а калі расліна вырастае, яе прадаюць і выручаныя грошы перадаюць грамадскай арганізацыі. За іх закупляюцца вучэбнае абсталяванне і сродкі для навучання, якія перадаюцца дзецям у Афрыцы. Усё гэта здымаецца на відэа, якое затым дэманструецца школьнікам, каб тыя бачылі, што іх намаганні прыносяць рэальную карысць. Нягледзячы на тую акалічнасць, што кветачка каштуе ўсяго 10—15 крон, бацькі плацяць за іх больш, і летась мы нават атрымалі дыплом, які сведчыць, што сабралі грошай больш, чым ва ўсіх іншых школах, якія таксама далучыліся да дабрачыннага праекта.

Некалькі гадоў таму школьны парламент прапанаваў рэканструяваць тэрыторыю, што знаходзілася побач са школай, — зрабіць з яе гульнявую пляцоўку, дзе можна было б адпачываць на вялікім перапынку. Прадумалі спартыўны рыштунак, нават абвясцілі конкурс на тое, як яна павінна выглядаць. І цяпер пляцоўка выкарыстоўваецца з карысцю для ўсіх. На чарзе — вырашэнне пытання з паліцыяй. Звычайна, калі дзеці ідуць у школу, для іх бяспекі побач з пешаходным пераходам дзяжурыць паліцэйскі. Вучні бачаць, што пераход побач са школай амаль што бяспечны. Сюды заязджаюць толькі бацькі, якія прывозяць у школу сваіх дзяцей, а потым іх забіраюць. Але крыху далей ёсць небяспечнае перакрыжаванне, дзе ходзяць трамвай, аднак там паліцэйскага няма. Школьны парламент вырашыў, што паліцыі трэба змяніць сваю дыслакацыю. Зараз гэту ідэю будуць афармляць, рабіць чарцяжы і накіроўваць прапановы ў паліцыю.

Няўжо адміністрацыя школы прыслухоўваецца да ўсіх дзіцячых прапаноў?

**— Калі мы не згодныя, то павінны растлумачыць дзецям, чаму не ідзём ім насустрач,** — запэўнівае Павел Марціноўскі. — Будынак школы налічвае шэсць паверхаў, але нашы дзеці ляную́цца хадзіць пешшу. Таму і прапанавалі зрабіць хуткасны спуск з апошняга паверха. Падышлі да справы адказна: вывучылі падрабязна гэта пытанне, даведаліся пра вытворцаў такога абсталявання. Але нам давялося ім растлумачыць, што іх ідэя нездзяйснімая ў сувязі з немагчымасцю выканання мер бяспекі. Мы стараемся і самых малодшых дзяцей рыхтаваць так, каб яны былі гатовы да дыскусіі. Для нас вельмі важна, каб дзіця магло сфармуляваць пытанне, таму што **часта пытанне нават больш важнае за адказ**, гэта сведчанне таго, што маленькі чалавек над чымсьці задумаўся. Калі нам удасца зрабіць гэта ў пачатковай школе, потым з дзецьмі будзе прасцей працаваць. У іншых установах адукацыі ўжо ведаюць, што **наша школа выпускае пэўны тып вучняў з крытычным мысленнем і ўменнем аргументаваць сваю пазіцыю**. Безумоўна, не ўсе школы працуюць так, як мы, многія прытрымліваюцца вельмі строгіх правілаў. Ці можа нашкодзіць дзецям шмат свабоды? Я так не думаю. Усё моцна залежыць ад асобы педагога і ад супрацоўніцтва з бацькамі. У нас ёсць школьны псіхолаг, які дапамагае не толькі працаваць з дзецьмі з асаблівасцямі развіцця, але і ў іншых складаных сітуацыях. Напрыклад, зараз мы спрабуем змагацца з мабільнымі тэлефонамі на ўроках у дзявятых класах. Калі па-добраму не атрымліваецца, можам быць і строгімі, таму што ў школьнай дэмакратыі таксама ёсць пэўныя рамкі, і калі яны парушаюцца, то ў сілу ўступае закон.

### Не толькі вялікія паўнамоцтвы...

Цікава, што ў Чэхіі самая высокая адзнака — 1 бал. А «пяцёрка» — гэта наша двойка ці нават кол. Але настаўнікі спрабуюць абысці гэту сістэму. Прыдумляюць палавінчатыя адзнакі, напрыклад выстаўляюць адзін з мінусам ці два з плюсам. У пачатковых класах пакуль ад папяровых дзённікаў не адмаўляюцца, таму што дзецям вельмі прыемна прынесці дамоў і паказаць бацькам свой «школьны пашпарт» з адзнакай, для іх гэта вельмі важна. А ў сярэдніх і старшых класах укаранёны ўжо электронны журнал, які з'яўляецца адным з галоўных сродкаў камунікацыі і не дублюецца на папяровых носьбітах. Доступ да яго ёсць як у школьнікаў, так і ў іх бацькоў, таму ні адзнакі, ні хатняя заданні ўжо не схаваеш... Да таго ж у кожнага вучня ёсць сваё партфоліа, куды сабраны ўсе работы, якія ў любы момант можна паказаць яго бацькам.

У школе «Вратыслаўска», якая робіць стаўку на інклюзію, налічваецца 310 вучняў. У адным класе іх можа быць ад 17 да 27. Дзяцей са спецыяльнымі патрэбамі зараз прыблізна трэцяя частка. Ёсць сярод школьнікаў дзеці не толькі з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, але і з рознымі іншымі спецыфічнымі адукацыйнымі і сацыяльнымі патрэбамі, напрыклад, дзеці з цыганскіх сем'яў, для якіх адукацыя не з'яўляецца каштоўнасцю, таксама нашчадкі імігрантаў з Украіны, Расіі, В'етнама, якія не вельмі добра валодаюць чэшскай мовай... Самая вялікая праблема — навучанне дзяцей з цыганскай дыяспары, таму што іх бацькі школу не заканчвалі і не разумеюць, навошта адукацыя іх нашчадкам, чаго не скажаш пра тых жа в'етнамцаў, якія, наадварот, вельмі матываваныя на вучобу.

У многіх вучняў — індывідуальная адукацыйная праграма. Над яе стварэннем працуюць школьны псіхолаг, спецыяльны педагог, класны кіраўнік і асістэнт педагога пры ўдзеле бацькоў. У класах з асаблівымі дзецьмі, як правіла, прысутнічае асістэнт, і нават не адзін — усё залежыць ад цяжкасці парушэнняў. Мінусам гэтай сістэмы Павел Марціноўскі лічыць неабходнасць запаўнення вялікай колькасці папер, бо для таго, каб прафінансаваць работу асістэнта, даводзіцца афіцыйна тлумачыць, чаму ён патрэбны, у якім аб'ёме і колькі патрабуецца сродкаў.

Калі ў класах ёсць 18 вучняў і больш, школа лічыцца фінансава самадастатковай. Пакольскі заробкі настаўнікаў залежаць ад колькасці вучняў, таму і класы тут вялікія — да 30 чалавек. **Адметнасць усіх чэшскіх школ — гэта іх аўтаномія.** Дырэктар, які выбіраецца на шэсць гадоў, можа самастойна вырашаць і педагагічныя пытанні, і кадравыя, і фінансавыя. На пасаду дырэктара абвяшчаюцца выбары, заявіць сваю кандыдатуру можа кожны, хто адпавядае агучаным крытэрыям. Камісія з васьмі чалавек, у склад якой абавязкова ўваходзяць прадстаўнікі бацькоўскай грамадскасці, вывучае ўсе заяўкі, праводзіць гутаркі з кожным прэтэндэнтам і прапануе ратушы свайго кандыдата. Калі школа працуе паспяхова, часцей за ўсё дырэктар перавыбіраецца на новы тэрмін. Праўда, бацькі, у якіх ёсць прэтэнзіі, могуць звярнуцца ў школьную інспекцыю, каб ініцыяваць дадатковую праверку, і, калі тая вырашыць, што справы ва ўстанове насамрэч ідуць не найлепшым чынам, яна можа хадайнічаць аб перавыбранні дырэктара. **Таму, з аднаго боку, у кіраўніка школы ёсць вельмі вялікія паўнамоцтвы, а з другога — не менш вялікая адказнасць.** Праўда, пра свой візіт, як і пра яго мэту, школьная інспекцыя заўсёды загадзя папярэджвае адміністрацыю навучальнай установы.

Яшчэ адна адметнасць — адсутнасць у чэшскіх школах адзіных вучэбных планаў. Вядома, дзяржава задае пэўныя рамкі, але навучальная ўстанова сама думае, чым іх напоўніць і якімі сродкамі дасягнуць чаканага выніку. Напрыклад, у школе ў Печках англійскую мову дзеці вывучаюць з трэцяга класа. А ў восьмым — дзявятым класах дадецца яшчэ адна замежная мова на выбар: нямецкая ці руская. Большасць дзяцей выбіраюць рускую мову. Зноў-такі другую замежную мову можна вывучаць тры гады па дзве гадзіны на тыдзень ці два гады — па тры гадзіны на тыдзень. На якім варыянце спыніцца, школа вырашае сама. Таксама самі настаўнікі-прадметнікі вырашаюць, які з адобраных міністэрствам адукацыі падручнікаў яны будуць карыстацца. Па кожнай дысцыпліне існуе шмат падручнікаў, пры гэтым усе яны вельмі моцна адрозніваюцца. Але падручнік — толькі адзін са шматлікіх рэсурсаў у навучанні.

— У сучасным свеце праблем з ведамі няма: вучню дастаткова толькі некалькі разоў клікнуць мышкай — і ён будзе ведаць больш за свайго настаўніка, — дзеліцца сваімі думкамі Павел Марціноўскі. — Куды важнейшыя ўменні і навыкі, тым больш што патрабаванні да выпускнікоў імкліва змяняюцца.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*
*Мінск—Прага—Мінск.*

*Пераемнасць традыцый*

# Пачуць «Голас студэнта» з мінулага

**Першыя газеты БДУ трапілі ў фонд Фундаментальнай бібліятэкі ўніверсітэта. Калекцыя лічбавых копій выданняў 1920—1930 гадоў была перададзена Расійскай нацыянальнай бібліятэкай (Санкт-Пецярбург) і размешчана ў Электроннай бібліятэцы БДУ.**

Арыгіналы газет 20—30-х гадоў мінулага стагоддзя былі згублены падчас Вялікай Айчыннай вайны. Адзінкавыя экзэмпляры захаваліся толькі ў бібліятэцы Санкт-Пецярбурга. Была праведзена вялікая работа па іх пошуку і дасягненні дамоўленасцяў па алічбоўцы і перадачы копій у БДУ. Усяго фонд універсітэта папоўніўся копіямі 81 газеты. У іх ліку нумары першых перыядычных выданняў універсітэта «Голас студэнта» (1920 год) і «Голас рабфакаўца» (1920 — пачатак 1930 гадоў). Аснову калекцыі складаюць экзэмпляры першай агульнаўніверсітэцкай шматтыражнай газеты «Ленінскі шлях», якая выйшла 27 лістапада 1929 года, а таксама газеты «За ленінскія кадры». Гэта тыя выданні, паслядоўнікам якіх стала выданне БДУ «Універсітэт».

Сярод публікацый у першых нумарах газет БДУ ёсць зварот першага рэктара ВНУ Уладзіміра Пічэты, верш вядомага беларускага празаіка, крытыка і драматурга Адама Бабарэкі і малавядомы даследчыкам фельетон Кузьмы Чорнага «Адстаючыя і перадавыя». Таксама ў газетах можна прачытаць звесткі аб адкрыцці новых вучэбных карпусоў, інтэрнатаў, аб рабоце факультэтаў, кафедраў, лабараторый, бібліятэкі, музеяў, гурткоў, секцый і іншае.

Візуальна дапоўняць гісторыю універсітэта 1920—1930 гадоў унікальныя фатаграфіі: партрэты выкладчыкаў і студэнтаў, рэпартажныя здымкі з заняткаў, універсітэцкіх мерапрыемстваў, а таксама здымкі ўніверсітэцкіх памяшканняў і будынкаў мінулых гадоў.

__Даведка.__ Газета БДУ «Універсітэт» з'яўляецца адным з найстарэйшых перыядычных выданняў Беларусі. Выдаецца з 1929 года, за сваю гісторыю неадноўчы пераймяноўвалася. У 2009 годзе выданне стала пераможцам V Нацыянальнага конкурсу друкаваных сродкаў масавай інфармацыі «Залатая Літара» ў намінацыі «Найлепшая шматтыражная газета». Цяпер тыраж «Універсітэта» складае тысячу экзэмпляраў. Распаўсюджваецца газета ў комплексе БДУ. Выдаецца раз на два тыдні на беларускай мове. У год выходзіць 20 нумароў, два спецвыпускі для абітурыентаў, два-тры тэматычныя спецвыпускі і дадаткі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

*Вучоба «ў полі»*

# Маладым следчым — пра браканьерства

**Практычны вопыт работы ў сферы прыродаахоўнай дзейнасці набылі маладыя следчыя з Магілёўскай вобласці, якія сабраліся на вучэннях у Чавускім раёне.**



Сваімі навыкамі з імі падзяліліся супрацоўнікі абласной інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету. Дзяржінспектары арганізавалі вучэбны пункт, які па легендзе з'яўляўся месцам незаконнага палявання.

Следчым-пачаткоўцам расказалі, якія доказы могуць быць выяўлены ў справе аб нелегальнай здабычы звера, як распазнаць мяса дзічыны і якім чынам падазраваныя спрабуюць схаваць сваю датычнасць да браканьерства. Пад кіраўніцтвам дзяржінспектараў маладыя работнікі следчых органаў правялі агляд месца незаконнага «палявання» і транспартнага сродку затрыманых «парушальнікаў». Гэтыя веды, замацаваныя на практыцы, дапамогуць работнікам-пачаткоўцам Следчага камітэта быць падрыхтаванымі пры расследаванні фактаў браканьерства.

Гэта ўжо не першы падобны вопыт супрацоўніцтва паміж Следчым камітэтам і Дзяржінспекцыяй аховы жывёльнага і расліннага свету. Напрыклад, летам работнікі Гомельскай аблінспекцыі прымалі ўдзел у вучэбных зборах, арганізаваным абласным следчым упраўленнем для супрацоўнікаў са стажам менш за два гады. Тады адным з пунктаў стажыроўкі для іх стаў умоўны выезд на месца незаконнага рыбалоўства. На беразе Сожа дзяржінспектары правялі «затрыманне» браканьераў, якія на маторнай лодцы займаліся здабычай рыбы пры дапамозе сетак. Прадэманстравалі следчым і іншыя забароненыя прылады лоўлі, расказалі, як падлічваецца нанесеная прыродзе шкода, што адбываецца з канфіскаваным уловам. Неад'емнай часткай навучання сталі і прыклады з практыкі дзяржінспектараў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

*Праявіць сябе*

# СІЛА І ДЗЕЙСНАСЦЬ ПРАФСАЮЗНЫХ ПЯРВІЧАК

**Калі ў сталіцы дабудуюць новы студэнцкі інтэрнат? На якую падтрымку могуць разлічваць маладыя сем'і? Як атрымаць прыбаўку да стыпендыі ў 90 рублёў? Ці будзе адменена працэдура размеркавання? Гэтыя і іншыя пытанні асвятляліся на сустрэчы студэнтаў са старшынёй Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі, прадстаўнікамі ФПБ і Мінадукацыі ў рамках акцыі «Вітаем, першакурснік!», куды было запрошана больш за 60 студэнтаў і навучэнцаў з розных універсітэтаў і каледжаў.**

## Таленты цэняцца ва ўсіх сэнсах

— Работа з моладдзю ў нашай краіне заўсёды была ў прыярытэце. Пацвярджэнне таму — дзяржпраграма «Адукацыя і маладзёжная палітыка на 2016—2020 гады», — адзначыла **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення выхаваўчай работы і маладзёжнай палітыкі Міністэрства адукацыі Таццяна СІМАНОЎСКАЯ.**

Такая ўвага невыпадковая. Амаль кожны пяты беларус — ва ўзросце да 31 года. У нас навучаецца 330 тысяч студэнтаў. Сёння дзяржаўныя выдаткі на адукацыю складаюць больш за пяць працэнтаў ад ВУП. Ёсць і належная нарматыўная база, і выкладчыцкі склад, які дазваляе рыхтаваць спецыялістаў для розных сфер эканомікі. Прычым апошнія гады сістэма адукацыі шчыльна працуе з заказчыкамі кадраў. Дзякуючы сумеснай рабоце відкрываюцца новыя спецыяльнасці, якія ўкараняюцца ў праграмы ўніверсітэтаў і каледжаў.

— Эфектыўна працуе механізм атрымання першага працоўнага месца. Наша краіна адзіная на постсавецкай прасторы захавала працэдуру размеркавання, — заўважае Таццяна Сіманоўская. — З гэтай нагоды мы часта падвяргаліся крытыцы з боку розных структур, але, калі прааналізавалі сітуацыю, аказалася, што не толькі студэнты, якія вучацца за бюджэтныя сродкі, але і платнікі жадаюць быць размеркаванымі. Бо гэта дае магчымасць атрымаць першае працоўнае месца спецыялісту без вопыту работы.

Шмат увагі ўдзяляецца падтрымцы таленавітых студэнтаў. У банку даных адоранай моладзі знаходзіцца інфармацыя аб амаль шасці тысячах выпускнікоў ВНУ. Лаўрэатам стыпендыяльнага фонду Прэзідэнта аказваецца сацыяльная падтрымка: яны могуць узяць па-за чаргой ільготныя крэдыты на будаўніцтва жылля, пры размеркаванні ім даецца пераважнае права пры выбары месца работы, а пры прыняцці на работу ў бюджэтныя арганізацыі такім выпускнікам павышаюць тарыфную стаўку на 15 працэнтаў.

— Адна з асноўных задач — сацыялізацыя моладзі. Трэба думаць, як уцягнуць яе ў актыўнае грамадскае жыццё, стварыць умовы і пляцоўку для таго, каб наша моладзь магла заявіць пра сябе і стаць ініцыятарам праектаў, — лічыць прадстаўнік міністэрства.

Цяпер стаіць пытанне аб неабходнасці распрацоўкі нарматыўнага дакумента, які будзе рэгуляваць парадак правядзення мерапрыемстваў у сферы маладзёжнай палітыкі. Гэта ініцыятыва паступіла з месцаў: будзе закон — будзе больш зразумела, якія формы работы можна выкарыстаць і атрымаць на іх фінансаванне. Мінадукацыі, дарэчы, ужо вядзе набор заявак на фінансаванне на 2018 год. Акцэнт — на буйнамаштабныя праекты, каб не распыляць грашовыя сродкі.




## Хто маніторыць праблемы навучэнцаў?

На сустрэчы ўздымалася важнае для студэнтаў пытанне забяспечанасці месцамі ў інтэрнатах. У цэлым па краіне 84 працэнты навучэнцаў, якім неабходна жыллё, заселены ў інтэрнаты. У некаторых рэгіёнах гэты паказчык даходзіць да 100 працэнтаў. Але ў Мінску з улікам таго, што сюды прыязджае шмат іншагародніх студэнтаў, сітуацыя горшая. Па словах Таццяны Сіманоўскай, плануецца, што да 2019 года дабудуецца апошні інтэрнат у студэнцкай вёсцы, разлічаны на 1800 месцаў. Акрамя гэтага, дзякуючы падтрымцы кітайскага інвестара, узводзіцца яшчэ адзін — для навучэнцаў БНТУ.

Аказваецца падтрымка маладым сем'ям. Яны маюць права на льготны крэдыт на пакупку жылля, на пазачарговае засяленне ў інтэрнат. Для тых, хто выхоўвае дзяцей, прадугледжана 11 відаў дзяржаўных дапамог. Сёлета ў БДТУ запусцілі міжуніверсітэцкі конкурс сярод студэнцкіх пар «Сямейнае шчасце — пачатак шляху». Налета яго хочуць зрабіць рэспубліканскім.

— Толькі на міжсектарыяльным узаемадзеянні мы зможам дасягнуць станоўчых вынікаў, — упэўнена Таццяна Сіманоўская. — Не можа адзін дзяржаўны орган ахапіць усе сферы, і добра, што ёсць партнёры, якія бяруць на сябе вялікі кавалак работы ў плане сацыяльнай падтрымкі, вырашэння пытанняў матэрыяльнага стымулявання. У гэтым вялікая заслуга прафсаюза. Туды ўваходзіць больш за 95 працэнтаў студэнтаў.

— Для нас год моладзі — кожны год, — кажа ў пацвярджэнне гэтых слоў **старшыня Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Аляксандр БОЙКА.** — Амаль кожны трэці член нашага прафсаюза — да 31 года. Мы праводзім шмат работы па папулярызацыі здаровага ладу жыцця, стараемся прыцягнуць моладзь у навуку ўжо з першых гадоў вучобы. Галоўнае, каб студэнты генерыравалі ідэі — чакаем нават самыя незвычайныя.

У 2016 годзе ў рамках галіновага прафсаюза быў створаны Маладзёжны савет. Яго галоўная мэта — маніторынг праблем студэнцтва. На працягу апошніх двух гадоў былі вырашаны сур'ёзныя пытанні. «Напрыклад, распрацаваны адзіны падыход да студэнтаў ВНУ ў вызначэнні цяжкага жыццёвага становішча пры прызначэнні сацыяльных стыпендый, — кажа **старшыня Маладзёжнага савета Міхаіл БАРЭЙША.** — Удалося дабіцца адтэрміноўкі ад воінскай службы для выпускнікоў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, якія размяркоўваюцца ў гэтыя ж каледжы для прадаўжэння работы: раней многія хлопцы пасля арміі проста не вярталіся працаваць у сістэму адукацыі. Мы прапанавалі таксама варыянты па змяненні сярэдняга бала для атрымання вучэбнай стыпендыі ва ўніверсітэтах».

Пэўную ўладу на месцах маюць і старшыні пярвічак. Так, большасць з іх уваходзіць у камісіі па стыпендыяльным забеспячэнні, таму ў стане ўплываць на студэнцтва «заробкі». Да таго ж грошы, якія збіраюцца ў пярвічных арганізацыях, там і застаюцца, прафсаюзы актыў на месцах сам імі распараджаецца.

А для саміх актывістаў, дарэчы, ёсць яшчэ адзін стымул праявіць сябе — стыпендыя ФПБ. Яна выплачваецца на працягу 10 месяцаў. Для студэнтаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў яе памер — дзве базавыя велічыні штомесяц, а для ВНУ — чатыры. Сёлета на прэмію было пададзена больш за 120 заявак.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*




# ЮНКАРЫ, ЧАКАЕМ ВАШЫХ ДОПІСАЎ!

**Нагадваем юным і маладым няштатным аўтарам, іх бацькам і настаўнікам, кіраўнікам гурткоў журналістыкі, што маладзёжны дадатак «Чырвонка. Чырвоная змена» сёлета чарговы раз абвясціў творчы конкурс «Я — малады. І мне не ўсё роўна!..»**

Ён разлічаны найперш на тых беларускамоўных юнакоў і дзяўчат, якія ў перспектыве хацелі б стаць журналістамі. Старонкі дадатку — гэта ў тым ліку і своеасаблівая творчая пляцоўка для самавыяўлення будучых «акул пяра». Апроч іншага, яна дае магчымасць сабраць партфоліа ўласных матэрыялаў, якое спатрэбіцца абітурыентам пры паступленні. А яшчэ падчас творчага конкурсу можна будзе атрымаць параду з боку прафесійных журналістаў, набыць карысны вопыт пры падрыхтоўцы матэрыялаў. Пераможцы і лаўрэаты творчага спаборніцтва, калі яны ў год перамогі ў ім збіраюцца на журфак, атрымліваюць ад рэдакцыі рэкамендацыі. Вядома ж, найлепшыя аўтары па рашэнні журы ўзнагароджваюцца сувенірамі і граматамі. Таму — далучайцеся! Адзіная просьба: не зацягвайце з адпраўкай сваіх «проб пяра». Часу наперадзе быццам бы шмат, але вы самі хутка здзівіцеся, як ён імгненна праляціць. Чакаем вашых допісаў!

Больш падрабязна азнаёміцца з умовамі конкурсу «Я — малады. І мне не ўсё роўна!..» можна ў маладзёжным дадатку «Чырвонка. Чырвоная змена» ад 14 верасня або на сайце «Звязды» ў раздзеле «Праекты». Усім — творчых поспехаў!

*Рух ад сэрца*

# Пабачыць свет, знайсці сябе

## БРСМ пацвердзіў акрэдытацыю ў Еўрапейскай валанцёрскай службе (EVS) да 2020 года

**Гэта адзін з праектаў праграмы Еўрасаюза Erasmus+. Нагадаем, што ўпершыню наш саюз маладзі атрымаў магчымасць далучыцца да агульнай еўрапейскай сеткі маладзёжных валанцёрскіх праектаў яшчэ ў 2014 годзе, што стала важным крокам у развіцці валанцёрскага руху БРСМ «Добрае Сэрца».**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

— Зноў пацвердзіць акрэдытацыю для нас было вельмі важна. Статус БРСМ у якасці афіцыйнага партнёра Еўрапейскай валанцёрскай службы дазваляе накіроўваць беларускіх валанцёраў для ўдзелу ў розных еўрапейскіх праектах і дае ім магчымасць прымяніць свае веды, уменні і навыкі не толькі на радзіме, але і ў еўрапейскіх краінах, — падкрэслівае **каардынатар EVS-праектаў Цэнтральнага камітэта БРСМ Алеся САЗАНКОВА.** — Сёння мы працягваем працаваць над атрыманнем акрэдытацыі ў Еўрапейскай валанцёрскай службе ў якасці прымаючага боку, што дазволіць добраахвотнікам з краін Еўрасаюза прыязджаць у Беларусь у якасці валанцёраў.

Сёлета па лініі праграмы Erasmus+ саюз моладзі прымаў удзел у трэцім Маладзёжным форуме Усходняга партнёрства, які праходзіў у Варшаве і сабраў каля 300 актывістаў, маладзёжных работнікаў і маладых палітыкаў з 33 еўрапейскіх краін, якія ўдзельнічаюць у праграме Еўрапейскага саюза Erasmus+ для абмеркавання пытанняў актыўнай грамадзянскай пазіцыі і ўдзелу моладзі ў працэсе прыняцця рашэнняў.

Актыўна ў рамках праграмы Erasmus+ развівае супрацоўніцтва Брэсцкі абласны камітэт БРСМ. У міжнародным абмене моладзь вобласці актыўна ўдзельнічае з верасня 2014 года. Па праграме Еўрапейскай валанцёрскай службы рэалізуюцца па два-тры сумесныя праекты ў год. У прыватнасці, актыў БРСМ прымае ўдзел у міжнародным праекце «Калейдаскоп еўрапейскіх традыцый», у якім задзейнічаны прадстаўнікі моладзі з Беларусі, Польшчы, Літвы і Германіі. Сёлета валанцёры з Брэсцкай вобласці наведвалі спецыялізаваны цэнтр па прыёме бежанцаў у польскім горадзе Бяла Падляска, прымалі ўдзел у міжнародным праекце «Міжкультурныя традыцыі».

### Як стаць удзельнікам праграмы?

Трэба звярнуцца да базы міжнародных EVS-праектаў http://europa.eu/youth/evs_database.

Выбраўшы той, які зацікавіў, валанцёр звяртаецца да арганізацыі, што адпраўляе ў краіну, дзе ён хацеў бы працаваць, — БРСМ. Пасля таго як прымаючы бок адобрыць кандыдатуру, падаецца заяўка на рэалізацыю праекта ў Еўрапейскую камісію, якая прымае рашэнне аб фінансаванні. У 80 працэнтах выпадкаў заяўкі ўхваляюцца. Тады бок бакі падпісваюць дагавор, і пасля афармлення візы і іншых дакументаў валанцёр выязджае ў іншую краіну.

### Якую накіраванасць маюць EVS-праекты?

Гэта мноства тэм: культура, спорт, сацыяльнае забеспячэнне, культурная спадчына, мастацтва, правы чалавека, абарона навакольнага асяроддзя, праца з моладдзю, беспрацоўныя, праца з людзьмі з абмежаванымі магчымасцямі, пенсіянерамі, дзецьмі і многае іншае. Адзін праект можа ахопліваць дзейнасць у рамках адной ці некалькіх тэм. Але гэта заўсёды будзе сацыяльна значны праект.

### Колькі часу працуюць валанцёры?

Працоўны дзень валанцёра можа выглядаць па-рознаму ў залежнасці ад праекта. У сярэднім валанцёр працуе 30—35 гадзін на тыдзень, мае два законныя выхадныя дні на тыдзень і дадаткова да гэтага ў яго ёсць два адпускныя дні на месяц, якія ён можа назапашваць і потым выкарыстаць, напрыклад, для падарожжа. Дзейнасць валанцёра не аплачваецца і не скіравана на атрыманне даходу.

### Якая працягласць праектаў?

Праект можа доўжыцца ад 2 да 12 месяцаў. Большасць маюць тэрмін ад 6 месяцаў да года.

### Якія выдаткі нясуць іх удзельнікі?

Кожны праект фінансуецца за кошт Еўрапейскай камісіі. Валанцёру пакрываюцца выдаткі на праезд да краіны знаходжання і назад, афармленне візы, выдзяляюцца грошы на харчаванне і кішэнныя выдаткі.

Таксама валанцёру даюць жыллё і медыцынскую страхоўку, якая пакрывае ўсе выдаткі па медыцынскім абслугоўванні. Акрамя таго, прадугледжаны курс вывучэння мовы краіны, дзе валанцёр будзе жыць і працаваць.

### Што будзе пасля заканчэння працы?

Акрамя неацэннага досведу, міжнародных кантактаў, новых прафесійных і асабістых навыкаў, валанцёр атрымлівае Youth Pass. Гэта сертыфікат, які сведчыць, што яго ўладальнік удзельнічаў у праграме EVS: ён змяшчае інфармацыю пра тое, што рабіў добраахвотнік, якіх вынікаў дасягнуў і чаму навучыўся. Youth Pass можа ўпрыгожыць любое рэзюмэ і партфоліа.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

# ДАПАМАГЧЫ ЎСМІХНУЦЦА


Яна Рапінчук...


...і Фібі.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

***— Вы забаўляеце дзяцей, якія шмат часу знаходзяцца ў бальніцы...***

— Не зусім так. Не трэба блытаць нас з аніматарамі ў курортных гатэлях і клоўнамі на цыркавой арэне. Тут — усё іншае. Наша мэта — вывесці дзіця са стану стрэсу, які выкліканы хваробай. Дапамагчы яму не баяцца медустановы, урачоў, уколаў, кропельніц, адцягнуць ад сумных думак, выклікаць усмешку... Вельмі часта адбываецца так, што хворыя дзеці з-за стрэсу ні з кім не кантактуюць, адмаўляюцца ад ежы на працягу некалькіх дзён. І толькі з дапамогай бальнічных клоўнаў іх атрымліваецца «разварушыць», прымусіць усміхнуцца і, у рэшце рэшт, проста накарміць. А часам дапамога патрэбна бацькам, і нават больш, чым дзецям.

...У нас няма ніякага клоўнскага макіяжу, бо дзеці могуць яго спалохацца. Толькі чырвоны нос (гэта наш галоўны атрыбут) і яркае адзенне. І тое — яркае ў меру. Ніякай дакучлівасці. Мы не будзем уваходзіць у палату і праз прымус «рабіць дабро» тым, хто гэтага не хоча. Часам людзі настолькі паглынутыя сваім горам, хваробай дзіцяці, што ім не да клоўнаў. А бывае, дарослыя ўсё гатовыя аддаць за ўсмешку малога — дапамагаюць, падыгрываюць нам і вельмі ўдзячныя. Медперсанал у большасці выпадкаў ставіцца да нас станоўча. Бо мы таксама, як і яны, зацікаўлены ў найхутчэйшым выздараўленні дзяцей.

***— А ці лёгка стаць бальнічным клоўнам?***

— Пачнём з таго, што далёка не кожны хацеў бы стаць ім. Бо гэта не так і проста псіхалагічна. Але для тых, хто жадае далучыцца да нашай каманды, усё празрыста: інфармацыя ёсць у адкрытым доступе ў інтэрнэце, можна падаць анлайн-заяўку. Але ж гэта адказная праца, якая патрабуе ведання асноў псіхалогіі, педагогікі, акцёрскага майстэрства, медыцыны... Прэтэндэнты праходзяць псіхалагічнае тэсціраванне, строгі адбор, навучанне ў школе бальнічнага клоўна і стажыроўку. А тыя, хто ўжо працуе, увесь час удасканальваюць свае веды: у нас пастаянна праходзяць навучальныя семінары, трэнінгі, дзяліцца вопытам прыязджаюць калегі з іншых краін свету... Так, у маі гэтага года на базе 4-й мінскай гарадской клінічнай бальніцы прайшоў II Рэспубліканскі форум бальнічных клоўнаў.

***— У якіх бальніцах даводзіцца працаваць?***

— Калі гаварыць пра Мінск, то ў аддзяленні дзіцячай хірургіі РНПЦ дзіцячай хірургіі, SOS Дзіцячая вёска Бараўляны, 4-й дзіцячай клінічнай бальніцы, Дзіцячым хоспісе ў вёсцы Ляскоўка. З задавальненнем наведваем і іншыя медустановы, дзіцячыя дамы. Словам — куды клічуць, дзе нам рады, там і працуем...

**«Гэта адказная праца, якая патрабуе ведання асноў псіхалогіі, педагогікі, акцёрскага майстэрства, медыцыны...»**

***— А чаму Фібі?***

— Гэта імя маёй любімай гераіні з тэлесерыяла «Сябры». Яно вельмі дзіцячае («Фібі-Бібі») і непасрэднае. Фібі — гэтакая капрызная і летуценная дзівачка, якая нібыта звалілася з воблака, з'явілася з невядомай краіны. Якой, дарэчы, я і з'яўляюся *(смяецца)*. Мая краіна — высока ў аблоках. Усё там паветранае, цёплае, утульнае. У кожнага клоўна ёсць такая. Часам яны выбіраюць сабе імя па законах гэтай краіны, імя, якое суадносіцца з іх унутраным светам, з асацыяцыямі з дзяцінства... А бывае так, што імя клоўну даюць дзеці.

***— Што асабіста табе дае ўдзел у гэтым праекце?***

— Для мяне ператварэнне ў Фібі — гэта пераход у свет дзяцінства. Быццам бы перазагрузка і ачышчэнне. Кожная сустрэча з хлопчыкамі і дзяўчаткамі, кожная палата — гэта вялікае поле для фантазіі і творчасці. Мне падабаецца дзяліць радасць з людзьмі, ствараць для іх маленькія аазісы шчасця. А яшчэ вельмі важным для мяне з'яўляецца тое, што заняткі бальнічнай клаўнадай маюць на ўвазе і велізарную працу над сабой. Магчымасць раскрываць свой творчы патэнцыял, пераадольваць унутраныя «заціскі», прымяняць на практыцы веды па педагогіцы, псіхалогіі...

***— Абодва твае заняткі — настаўнік і бальнічны клоўн, — вядома, узаемадзейнічаюць адзін з адным, дапаўняюць?***

— Безумоўна! Дзякуючы клоўну, які існуе ўва мне, лягчэй праводзіць урокі, трымаць дысцыпліну ў класе (як гэта ні дзіўна), наладжваць кантакт з дзецьмі. Бо яны найлепей успрымаюць інфармацыю і засвойваюць матэрыял, калі ён пададзены цікава, у выглядзе гульні.

***— А як блізкія ці калегі ставяцца да такой тваёй дзейнасці?***

— Блізкія, вядома, падтрымліваюць, хоць самі і не падзяляюць маё захапленне. А калегі... Яны проста не ведаюць пра гэта...

***— Пасля публікацыі, мабыць, даведаюцца...***

— *(Усміхаецца.)* Я не супраць... Тым больш што мэта нашага аб'яднання ў наступным годзе — «заваяваць» (у найлепшым сэнсе гэтага слова!) як мага больш гарадоў Беларусі...

**Паліна ПРАКАПЕНЯ.**

## ❍ Даведка

**Рух «бальнічных клоўнаў» зарадзіўся ў ЗША ў 70-я гады мінулага стагоддзя. Яго заснавальнік — Хантэр Доэрці Адамс — урач і грамадскі дзеяч. Сёння існуе больш за трыццаць розных арганізацый, якія займаюцца бальнічнай клаўнадай. Паслядоўнікі доктара Адамса па ўсім свеце аказваюць сацыяльна-псіхалагічную дапамогу дзецям, якія знаходзяцца на працяглым лячэнні ў стацыянарах бальніц, садзейнічаюць іх рэабілітацыі, кантактуюць таксама з сем'ямі дзяцей. Станоўчы ўплыў бальнічнага клоўна на фізічны і эмацыйны стан хлопчыкаў і дзяўчатак даказаны навукоўцамі многіх краін. У Амерыцы яны завітваюць не толькі да дзяцей, але і да дарослых, якія знаходзяцца ў лячэбных установах, дамах састарэлых.**

**У Беларусі рух «Бальнічныя клоўны» пачаўся з Гомеля прыкладна дзесяць гадоў таму і ўжо дабраўся да сталіцы, закрануўшы і яшчэ некалькі гарадоў: Брэст, Віцебск, Мядзел, Чачэрск...**

Свой погляд

# ТРАДЫЦЫЯ + ПРАВАКАЦЫЯ,

## або Чаго не хапае сучаснаму мастацтву



**Аксіння СЯЛІЦКАЯ — адна з самых маладых мастацтвазнаўцаў у краіне, але дзяўчына паспела заваяваць аўтарытэт і стаць арганізатарам паспяховых праектаў, звязаных з беларускім мастацтвам. Яна расказала, што было штуршком да асваення такой цікавай прафесіі, як змагла пераадолець комплекс узросту, бо звычайна названы занятак асацыюецца са сталасцю.**

— Маладосць для мастацтвазнаўцы — гэта і плюс і мінус. Мне было 27 гадоў, калі пачала курыраваць першыя праекты. Я, вядома, адчувала скепсіс, таму што многія лічылі, што ў мяне той узрост, калі чалавек не можа праявіць сябе з пункту гледжання досведу, але я ішла да мэты і працягваю яе дасягаць. Галоўнае, перамагчы ў сабе страх памылкі, таму што спачатку ён прымушае цябе спатыкацца. Але ў адзін момант мяне вельмі падтрымаў муж, калі спытаў: хачу я быць мастацтвазнаўцам альбо ўсё ж застануся добрым выкладчыкам мастацтва? Гэтыя словы мяне зачапілі, і я пачала змагацца з сумненнямі.

***— Мастацтвазнаўца — гэта не тая прафесія, пра якую мараць з дзяцінства. Як вы прыйшлі да яе?***

— Па сваёй першай адукацыі я музыкант. Калі вучылася, час быў заняты музычным удасканаленнем, на мяне вялікі ўплыў зрабіў такі прадмет, як музычная літаратура. Мы вывучалі гісторыю еўрапейскай, рускай і крыху беларускай музыкі. На другім курсе праходзілі творчасць французскіх імпрэсіяністаў. Так супала, што мне была блізкая і музыка кампазітараў, і паэзія, і жывапіс таго перыяду. Асабліва ўражваў жывапіс Клода Манэ, П'ера Агюста Рэнуара. Пасля таго як атрымала першую адукацыю, працягнула навучанне ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў на кафедры Сусветнай і айчыннай мастацкай культуры. У нас была вялікая колькасць прадметаў, звязаных з мастацтвам: гісторыя жывапісу, кінематографа, фатаграфіі, тэатра, харэаграфіі, літаратуры... Усе веды, якімі я авалодала і якія набывала, сталі вялікім штуршком на шляху фарміравання густу ў мастацтве.

Разам з тым мяне захапіла арттэрапія. Гэты кірунак малавядомы ў нашай краіне, але ён мае добрую перспектыву. Арт-тэрапія дапамагае зразумець, як пэўныя творы мастацтва могуць уплываць на псіхалагічныя працэсы чалавека. Я не прафесіянал, але мне хочацца развіваць гэта. Дарэчы, арт-тэрапія дапамагае вывучаць колер, які мае вялікае значэнне не толькі ў жывапісе, але і ў жыцці чалавека.

***— Вучыцца на мастацтвазнаўцу і стаць ім — розныя рэчы...***

— У нас была досыць добрая падрыхтоўка, але ў асноўным з навукова-акадэмічным падыходам. У плане практычным, на жаль, не было магчымасці паспрабаваць сябе ў ролі куратара, кіраўніка, ініцыятара хоць бы маленькага арт-праекта. Таму, калі я стала займацца мастацтвазнаўствам практычным, калі пачала прасоўваць ідэі выставак, камунікаваць з мастакамі, мне было некамфортна. Самае складанае было адысці ад навуковага падыходу і паказаць сябе практыкам — не толькі прафесіяналам, але і аматарам мастацтва. Таму асабіста маё меркаванне: беларускім ВНУ, дзе выкладаюць мастацтвазнаўства, трэба больш актыўна працаваць над практычнай рэалізацыяй будучых спецыялістаў, каб студэнты хутчэй засвойвалі прафесію як універсальная мастацтвазнаўцы. Аднак, нягледзячы на адсутнасць практычнай падрыхтоўкі, калі ёсць жаданне, ты можаш уліцца ў гэтую прастору і сцвердзіць сябе. Так адбылося са мной.

Для маладога крытыка мае значэнне аб'ём прачытанай літаратуры. Яна можа быць навуковай, мастацкай, пазнавальнай. Мастацтвазнаўца павінен чытаць шмат. Ну і зыходзячы з таго, што мы жывём у Беларусі, для мяне заўсёды было важна валодаць роднай мовай дасканала. Гэта, як аказалася, таксама адзін з вырашальных фактараў у нашай прафесіі.

***— Калі вы толькі трапілі ў творчае асяроддзе, якое стаўленне было да вас з боку мастакоў, іншых мастацтвазнаўцаў, гледача?***

— Калі пачала выкладаць у Мінскім мастацкім каледжы імя Я. Глебава, то падчас размоў з выкладчыкамі, мастакамі пачала больш утульна адчуваць сябе ў арт-прасторы. У нас знаходзіліся агульныя тэмы, падыходы і погляды на мастацтва. Камунікаваць з мастакамі на свабодным узроўні мне станавілася прасцей, што прывяло да прафесійных кантактаў і рэалізацыі розных ідэй. Мастакі ў сваю чаргу сталі ўва мне бачыць аднадумцу.

| **Продавец** | Берестовицкий филиал Гродненского областного потребительского общества<br>231778, г. п. Берестовица, ул. Советская, 2 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38 |
| **Условия аукциона** | Без условий |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Y44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 12 декабря 2017 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3-209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица; *индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются: представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя; физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица; представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов по названной аукционистом цене. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг), с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 6 декабря 2017 г. до 15.00**

*Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»*

**http://grodnoino.by**

## Изменения в проектной декларации ООО «ДАТЧ СТАР»

Опубликованной в газете «Звязда» 17.05.2017 г. №91 «Многоквартирный жилой дом с подземной гараж-стоянкой (№1 по генплану в квартале пр. Дзержинского – ул. Щорса – ул. Железнодорожная – ул. Хмелевского) со встроенно-пристроенными объектами обслуживания населения» I очередь строительства, 6-11-е секции, II очередь строительства, секции 1-3)» (I очередь строительства 5-6-й пусковой комплекс).

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предлагаются:

5 (пять) однокомнатных квартир по принципу «свободной планировки» площадью от 40,88 до 48,48 кв. м: стоимость 1 кв. м от 1100 до 1300 долларов США.

На предприятии действует система регулирования стоимости, зависимая от площади, этажа и условий оплаты строящегося жилого помещения».

Дополнительную информацию можно получить по адресу:
г. Минск, ул. 3-я Щорса, 9, офис 505.
Тел.: + 375 44 53 43 000, + 375 29 53 43 000.

УНП 191061436

SEX=БАЛЯСЫ

# БЫЦЬ НЕ ЯК УСЕ

**Шчыра прызнаюся: не паспяваю сачыць за сучаснымі трэндамі ў маладзёжным асяроддзі. Дзякуючы сеціву яны з'яўляюцца і распаўсюджваюцца, як грыбы пасля дажджу ў добрае надвор'е. («Спадзяюся, гадоў праз 40 усё ж увядуць ордэн за заслугі перад інтэрнэтам, інакш навошта гэта ўсё?») Не, ну сачыць за тэндэнцыямі яшчэ як-ніяк спраўляюся, а вось прааналізаваць, параўнаць... Толькі наважышся напісаць калонку, прысвечаную нейкай новай з'яве, як ужо на падыходзе — чарговая. («Не паспееш ажаніцца, як ужо падрасло цэлае пакаленне маладзейшых жонак».) Памятаеце, нават дзеці яшчэ нядаўна захапляліся бонсцікамі, а цяпер на слыху іх новая забаўка — спінеры? («Нашы людзі ў смузечную на гіраскутары не ездзяць».) Ну, тут малеча, што з яе ўзяць? Некалі збіралі маркі, манеты, марылі пра кубік Рубіка, зараз вось новыя рэаліі, новыя цацкі. («Пра цяперашніх школьнікаў можна зняць толькі «Перапіска «УКантакце» Пятрова і Васечкіна» і «Статусы Пятрова і Васечкіна ў «Твітары».) Жартую, вядома, што яшчэ застаецца рабіць? («Канфлікт пакаленняў». — Превед! — Дратуці!») Але парадокс сітуацыі заключаецца ў тым, што, жадаючы быць не як усе (чытай: мець нешта адметнае, асаблівае; не так, як іншыя, выглядаць), мы часам становімся той большасцю, ад якой імкнуліся адысці...**



Фота Надзеі БУЖАН.

Напрыклад, кітайскія карыстальніцы сеціва выдумалі для сябе новы спосаб праверкі стройнасці фігуры. Праходзяць тэст толькі тыя дзяўчаты, талія якіх цалкам хаваецца за звычайным аркушам паперы фармату А4. Яго шырыня — 21 сантыметр. Ну, добра, няхай так вымяраюць аб'ёмы, калі іншыя спосабы надакучылі. («Я вельмі, вельмі стараюся сачыць за сваёй фігурай. Але толькі пераключу ўвагу, яна ўжо нешта жарэ».) Але прайшло ўсяго нічога, і кітайскія дзяўчаты паклалі пачатак новаму трэнду: яны здымаюць на тэлефон свае агаленыя грудзі, сціскаючы іх рукамі ў форме сэрцайка. І ў чым сэнс гэтага пасылу? Такім чынам, аказваецца, удзельніцы флэшмоба спрабуюць даказаць, што сапраўды маюць вялікі бюст. («Аксана бачыць, што Алегу не вельмі падабаецца салата, і раскрывае галоўны козыр — халат».) А часам трэнд і бокам выйсці можа. Ва ўсё тых жа жыхарак Кітая стала папулярным апошнім часам лятаць у Паўднёвую Карэю і рабіць там пластычныя аперацыі. І вось тры «прыгажуні» пасля гэтай працэдуры сталі такія непадобныя на свае фатаграфіі ў пашпартах, што не змаглі адразу вярнуцца на радзіму. Іх з распухлымі і перавязанымі (і вельмі разгубленымі) пасля аперацый тварамі затрымалі супрацоўнікі пашпартнага кантролю. («Аб'ява ў паліклініцы: «Усіх, хто зразумееў сэнс жыцця, псіхіятр прымае па-за чаргой».)

Брытанскія і амерыканскія выданні пісалі пра новую моду, якая з'явілася ў Інстаграме і іншых сацыяльных сетках. Дзяўчаты пачалі хадзіць у начныя клубы ў адной... ізаляцыйнай стужцы ці скотчы. Вось так, замест ніжняй бялізны і адзення. Далібог, праўда! Проста наклейваюць чорныя кавалачкі адмысловым чынам на інтымныя месцы, каб было падобна на споднее, і — уперад з песнямі. («Не выносъ мне мозг! — Яго туды і не заносілі!»)

Увогуле, у пагоні вылучыцца праз адзенне многія трапляюць у кур'ёзныя сітуацыі. Як Бузава і колішняя жонка стваральніка «Ералаша» Грачэўская, якія нядаўна з'явіліся на ўручэнне музычнай прэміі ў аднолькавых «голых» камбінезонах. Для любой жанчыны такая сітуацыя — жах, а калі апроч адзення больш і вылучыцца няма чым... (З фільма «Самая абаяльная і прыцягальная». «Кардэн! У нас у Саюзе дзве-тры адзінкі такіх. І тое — у жонак дыпламатаў краін, якія не далучыліся!») Але камбінезоны сталі галоўнай навіной — замест той самай прэміі. Якая музыка, маўляў, такія і сенсацыі. («Бузава — гэта ідэальны прыклад таго, як цёлка, жадаючы задзяўбці былога, задзеўбвае ўсю краіну».)

**Дзяўчаты пачалі хадзіць у начныя клубы ў адной... ізаляцыйнай стужцы ці скотчы. Далібог, праўда!**

Але бываюць і процілеглыя сітуацыі. У тым ліку і ў нашай краіне ўзнікла такая з'ява, як «за шмот адкажаш». У маладзёжным асяроддзі прынята насіць абутак і адзенне пэўных брэндаў, гэта зразумела. (З таго ж фільма. «Не бачыш? Па катоне і лэйбле?») Аднак знаходзяцца прыхільнікі «чысціні радоў», якія ўчыняюць псіхалагічны гвалт над равеснікамі, якім бацькі набылі... «не тыя» рэчы. Пасыл у тым, што няшчасны, калі ён не лох, не павінен вылучацца сярод іншых. А вось гэта ўжо зусім не смешна — «за вушы да шчасця...»

...Напрыканцы выкажу банальную, але простую ісціну. Быць не як усе — гэта заставацца самім сабой. Каб цябе пазнавалі толькі па ўласцівых менавіта табе якасцях. («Часам мужа ад мяне проста трасе! Усё ж такі я ашаламляльная жанчына».) Ды што там па якасцях? Я, напрыклад, нават калі проста іду па рэдакцыйным калідоры, калегі кажуць, што адразу пазнаюць, хто гэта, — па грукаце, як той казаў, «капытоў». («Вопытны начальнік па стуку клавіятуры разумее, хто чым з падначаленых займаецца».) Дарэчы, па гэтым простым жыццёвым прынцыпе пабудавала сваё выступленне каманда Найвышэйшай Ліга КВЗ «Казахі», якая нарэшце перамагла ў Летнім кубку — 2017. У іх быў скразны жарт праз усю гульню, якраз у нашу тэму. Зразумее той, хто глядзеў выступленне. «Хан, гэта я!» Таму — будзьце самі сабой! («Не крыўдзіце тых, хто вас любіць. Ім і так ужо дасталося».)

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «У мяне заўсёды ёсць месца святу»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

***— Ці часта сутыкаліся з тым, што трэба зрабіць выбар? Ці хутка можаце прыняць рашэнне? Які выбар у вашым жыцці быў самы складаны?***

— Ён мне заўсёды даваўся складана. Таму бяруся за ўсё і адразу, каб не выбіраць. Самым складаным у маім жыцці было вызначыцца: Масква ці Мінск, «Ранішняя пошта» ці «Усё нармальна, мама!» і выбраць аркестр. Выбар свой я зрабіла на карысць Мінска, як вы разумееце, і цяпер не шкадую аб гэтым.

***— Вы спрабавалі сябе ў ролі вядучай розных праграм, спявачкі. Якая з гэтых роляў бліжэйшая? У якім кіно вы хацелі б зняцца?***

— Нават калі я спяваю, усё роўна стараюся ўнесці нейкія эмоцыі, нейкія акцёрскія «прыёмы». Таму, думаю, бліжэйшая мне роля вядучай. Што датычыцца кіно, я здымалася ўжо ў некаторых фільмах, напрыклад «Прывітанне ад Чарлітрубача», «Каменская», «Закон». Цяпер хацела б зняцца ў кіно пра 1990-я. Вельмі хачу, каб у ролях былі нашы пазнавальныя асобы, артысты, спартсмены.

***— Раскажыце пра ўдзел у праекце «Бітва гарадоў». Як туды трапілі? Што ён даў вам?***

— Захапляюся гэтым праектам і ганаруся сваёй віцебскай камандай! Мы былі адным арганізмам, які быў не згодны проста на ўдзел. Толькі на перамогу! І мы гэта зрабілі і перамаглі! Вярнуліся ўсе з траўмамі, я два тыдні на ўколах была з-за спіны. Але мы былі вельмі задаволеныя сабой, а гэта галоўнае. Потым быў праект «Бітва тытанаў» з іншымі краінамі. Таксама было выдатна, мы вельмі стараліся, змагаліся. Але журы адкрыта дапамагала іншай камандзе. Гэта азмрочыла нашу паездку, але мы былі ўсё роўна шчаслівыя. Занялі другое месца, але ўспрымалі яго як першае! Той праект паказаў мне, наколькі моцнай і цягавітай я магу быць у розных сітуацыях. І галоўнае, што я зразумела, — ніколі ў жыцці не трэба адчайвацца і апускаць рукі.

***— Многія лічаць, што пікам вашай папулярнасці стаў удзел у праекце «Ранішняя пошта». Але ў многіх інтэрв'ю вы кажаце, што з таго часу ў вас няма ні адной фатаграфіі з Юрыем Нікалаевым. Як так атрымалася?***

— Пра фота з Нікалаевым сапраўды пацешна выйшла, яго насамрэч няма. У Маскве я сутыкнулася з жорсткім законам шоу-бізнесу, пра які нават не здагадвалася. Нас шмат фатаграфавалі, я разлічвала, што ў мяне будуць здымкі. А потым аказалася, што за фота трэба плаціць. У мяне тады не было такіх грошай. А фотаапарат я не брала, не думала, што так хутка скончыцца мая «казка». Думала, што ў нас будзе яшчэ шмат на гэта часу... Што мяне яшчэ ўразіла тады? Прыходзілі журналісты і бралі інтэрв'ю толькі ў Юрыя Нікалаева. Пра мяне — ні слова. Потым даведалася, што артыкулы праплачаны і я тут як бы ні пры чым. Вядома, не магла такога чакаць, дома ў той час да мяне чарга стаяла з журналістаў. Тады і зразумела, што ўсё ж такі не ўсё ў свеце так, як здавалася мне раней.



***— Для многіх ваша імя асацыюецца выключна з праграмай «Усё нармальна, мама!». А якія праекты ў вас самой выклікаюць большы інтарэс?***

— Я люблю экстрэмальныя праграмы, напрыклад, «Бітву тытанаў», якая ўжо згадвалася ў нашай гутарцы, «Смак 2017» — гэта праект ад кавы «Барыста». Дарэчы, у ім я перамагла свой страх вышыні, на апошнім этапе конкурсу ў мяне быў нумар паветранай гімнасткі. Літаральна за адну рэпетыцыю я змагла гэта зрабіць. Зараз лічу тое сваёй маленькай перамогай. А калі казаць пра асабісты гонар, то гэта, вядома, мае дзеці.

***— Як адбіваюцца пастаянныя гастролі і рэпетыцыі на вашых з імі адносінах?***

— Я думаю, большасць сучасных бацькоў не так часта бываюць дома. Мне здаецца, тут справа не ў колькасці праведзенага часу, а ў якасці. Я, як педагог пачатковых класаў, выдатна гэта разумею. Трэба гутарыць з дзецьмі не пра школу і ўрокі, бо гэта не адзіныя тэмы для размовы.

***— Вы ніколі не карысталіся паслугамі нянек. Чаму? Як у вас хапае энергіі на работу і сям'ю?***

— У мяне надзейны тыл, у якім я заўсёды ўпэўнена і магу з лёгкасцю на яго здацца, — гэта мае мама і тата. Таксама ў мяне шмат сваякоў, сёстры стрыечныя, усе мне заўсёды і ва ўсім дапамагаюць. Таму і спраўляюся. Навошта мне староннія людзі, калі і сваіх хапае?

***— Многія кажуць, што вы «жанчына-свята», і цяпер гэта не толькі з-за гарэзлівага характару, але і з-за вашага агенцтва. Раскажыце, як з'явілася ідэя яго стварэння?***

— Ідэя прыйшла, калі я была цяжарная другі раз і чакала сына Арсеня. Мне хацелася займацца яшчэ чымсьці акрамя канцэртнай дзейнасці, хацелася свой бізнес. Думала шмат часу, перабірала розныя варыянты: крама з тэатральнай і кіношнай тэмай, салон прыгажосці, крама для матуль і дзяцей, кавярня... Але з-за таго, што я нічога не разумею ў крамах, вырашыла не рызыкаваць. І прыйшла ідэя івэнтагенцтва. Я якраз пазнаёмілася з Тацццянай, якая таксама хацела займацца гэтай дзейнасцю. Мы аб'ядналіся і атрымалася «Святочнае бюро». Так што ў мяне цяпер заўсёды ёсць месца святу.

**«Самым складаным у маім жыцці было вызначыцца: Масква ці Мінск, «Ранішняя пошта» ці «Усё нармальна, мама!» і выбраць аркестр».**

***— Вы часта наладжваеце іх для іншых людзей. А што самі выбралі б: ціхі ўтульны вечар дома ці шумную вечарынку з сябрамі? Ці часта ваш дом прымае гасцей?***

— Мне вельмі не хапае цішыні ў апошні час. Эмацыянальна я спустошана і, вядома, мне б хацелася адпачыць, але не дома. Там нас вельмі шмат. Трэба ехаць куды-небудзь, але я пакуль не магу, таму што мая малодшанькая Алёна ўсё яшчэ на грудным выкормліванні. Так што адпачнём пазней. А наконт таго, ці часта ў нас госці? Сачыце ў Інстаграме. Амаль кожныя выхадныя мой дом напаўняюць сябры. Я люблю гасцей, шумныя кампаніі, люблю, калі людзям добра!

**Ангеліна НОВІКАВА, студэнтка І курса Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.**

***Цалкам інтэрв'ю чытайце на сайце zvyazda.by***

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда», грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.008.
Нумар падпісаны ў 19.30 8.11.2017 г.

■ Псіхалогія для ўсіх

# СІНДРОМ ПРАЧЫТАНАЙ КНІГІ

## Якія крызісы падсцерагаюць нас у шлюбе?

**З уступленнем у шлюб казка заканчваецца. Пачынаюцца будні, пастаяннае суіснаванне з партнёрам — новая стадыя стасункаў. Калі нейкая з'ява пераходзіць у новую стадыю развіцця або іншую якасць, кажуць пра крызіс — момант, які ясна паказвае, што з'ява ўжо не вернецца на мінулы этап, але яшчэ невядома, у які бок усё будзе змяняцца.**

— Часта сямейныя крызісы супадаюць з крызісамі асобы — усё ж такі кожны чалавек развіваецца індывідуальна, — заўважае **намеснік галоўнага ўрача па памежнай псіхіятрыі Мінскага гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Наталля БЕРАЗОЎСКАЯ.** — У той час як адзін робіць некалькі скачкоў наперад, іншы здольны ўсяго на адзін або і таго менш, бо яго ўсё задавальняе! Самыя моцныя крызісы адбываюцца калі нехта ў наша жыццё прыходзіць (уступленне ў шлюб, нараджэнне нашчадкаў) або сыходзіць з яго (аддзяленне дзяцей, смерць). Кожная сям'я праходзіць праз некалькі крызісаў.

✓ Уступленне ў шлюб. Проза сямейнага жыцця здымае ружовыя акуляры.

✓ Жанчына мяняе прозвішча. Адбываецца наладжванне стасункаў са сваякамі. Маладыя павінны дамовіцца не толькі паміж сабой аб тым, як будуць жыць, але яшчэ і з бацькамі аб тым, як малая сям'я будзе суіснаваць унутры вялікай.

✓ Пакуль няма дзяцей. Гэта крызісная фаза надыходзіць праз 6—9 месяцаў пасля вяселля і можа доўжыцца да 1,5 года. Недахопы партнёра становяцца заўважнымі. Ад партнёра пачынаюць патрабаваць таго, што давалі бацькі. Пачынаецца размеркаванне абавязкаў. Устанаўліваюцца межы: што можа сабе дазволіць кожны, што рабіць з рознымі сямейнымі традыцыямі. Навальваюцца матэрыяльныя і жыллёвыя цяжкасці. Дробязі (шкарпэткі па кутах і незакрыты цюбік пасты) становяцца прычынай сварак і высвятлення адносін.

✓ З'яўленне дзяцей. Статус жанчыны мяняецца, яна губляе ролю дзіцяці. Неабходнасць сядзець дома выклікае пачуццё адзіноты. Не выключана зніжэнне сексуальнай прывабнасці, а таму другая палова можа дазволіць сабе сёе-тое па-за межамі сям'і. Як вынік — пасляродавая дэпрэсія. А калі дзіця ідзе ў школу, бацькоў пачынаюць ацэньваць з пазіцыі таго, наколькі добра яно падрыхтаванае, як яно выхавана. А ў поглядах мамы і таты нярэдка ёсць супярэчнасці, а тое і дыяметральна процілеглыя пункты гледжання. Гэты час можа супадаць з крызісам сёмага года шлюбу, які характарызуецца сіндромам «прачытанай кнігі». Партнёрам здаецца, быццам, яны настолькі ведаюць адно аднаго, што нічога новага ў іх сямейным жыцці не прадбачыцца. Нярэдка гэта думка штурхае і мужчын, і жанчын на пошук флірту, палюбоўнікаў, інтрыг, сексуальных эксперыментаў.

**Ёсць шмат варыянтаў выхаду з сітуацыі, але заўсёды застаецца магчымасць ставіцца адно да аднаго з павагай.**

✓ Крызіс сярэдзіны жыцця, стадыя спелага шлюбу. Да мужчыны прыходзіць разуменне планкі кар'еры. Жанчына сутыкаецца з узроставымі зменамі: страта прыгажосці, прывабнасці. Здрады ў гэты час могуць быць кампенсацыяй страты маладосці, праблем у інтымным жыцці. А тут яшчэ праблемы з дзецьмі-падлеткамі, якія патрабуюць большай незалежнасці, іх неабходна адпускаць. Нагадваюць пра сябе і састарэлыя бацькі.

✓ Дзеці пакідаюць дом. Прызнаць іх дарослаць нялёгка. Узнікае рэўнасць да іх партнёраў, крыўда, імкненне захаваць уплыў.

✓ Пакінутае гняздо. Эмацыянальны вакуум запаўняецца імкненнем кіраваць дзецьмі на адлегласці, любымі сродкамі прыцягваць унукаў, спробы спаборнічаць у тым, хто больш дапамагае.

✓ Жыццё аднаго партнёра пасля смерці другога. З'яўляецца пачуццё непатрэбнасці: любага няма — навошта жыць? Або наадварот, узнікае страх смерці.

— Самая важная задача кожнага члена сям'і падчас любога крызісу — аднавіць узаемаразуменне, не ігнараваць пачуцці і пажаданні свайго партнёра. Размова не аб тым, драўлянае ў нас вяселле або сярэбранае, а ў тым, што ўнутры нас пад уздзеяннем знешніх абставін адбываюцца перамены. Не заўсёды адразу можна вызначыць, добрай ці дрэннай для шлюбу з'яўляецца тая ці іншая падзея. І як менавіта рэагаваць на стрэс. Ёсць шмат варыянтаў выхаду з сітуацыі, але заўсёды застаецца магчымасць ставіцца адно да аднаго з павагай. Пасля буры можа з'явіцца вясёлка. Аптымістычна настроеныя пары больш цэняць сумеснае жыццё, бо імкнуцца навесці масты і мяркуюць, што няма добрага без дрэннага. Гэта думка павінна дапамагчы перажыць з найменшымі стратамі крызісы, праз якія непазбежна праходзім усе мы ■

■ Беражыце дзяцей

# БЯГОМ — АД СКАЛІЁЗУ, АТЛУСЦЕННЯ І ДЫЯБЕТУ

## Гіпадынамія з'яўляецца прычынай шматлікіх праблем са здароўем

**Як вынік — 35 працэнтаў тых, каму ад 0 да 18 гадоў, маюць лішнюю вагу. Гэта, вядома, менш, чым у ЗША, дзе з павышанай масай цела ўжо каля 80 працэнтаў дзяцей і падлеткаў, аднак лічба і ў нас мае тэндэнцыю да росту.**
**Перад бацькамі паўстае важная задача: да 9—10 гадоў сфарміраваць у дзіцяці ўсе асноўныя стэрэатыпы паводзінаў, у тым ліку рухальнай актыўнасці.**



Недастатковая рухальная актыўнасць у раннім узросце прыводзіць у далейшым да набору вагі, атлусцення, артэрыяльнай гіпертэнзіі, цукровага дыябету.

Не на карысць такі стан і касцявой сістэме: гіпадынамія літаральна на працягу некалькіх дзён парушае кальцыевы і магніевы абмен, а праз два тыдні пачынаецца фарміраванне астэапарозу — косці становяцца больш слабымі. Адсюль і незлічоныя выпадкі парушэння паставы ў школьнікаў.

Моцна пакутуе ў дзяцей і мышачная сістэма. Вядома, што адсутнасць руху на працягу двух месяцаў змяншае мышачную сілу на 25 працэнтаў. Мышцы ёсць ва ўсіх органах, уключаючы сэрца і сасуды, і ад таго, у якой форме знаходзіцца мышачная тканка, залежыць якасць работы нашага «матора». Чым слабейшыя мышцы сасудаў і сэрца, тым горш прапампоўваецца патрэбны аб'ём крыві, што выражаецца пачашчаным сэрцабіццём, павышаным ціскам. Пры парушаным кровазвароце ўтвараецца дэфіцыт кіслароду, ад чаго пачынае пакутаваць нервовая сістэма — з'яўляецца раздражняльнасць, хуткая стомленасць, знясіленне. Рух здымае эмацыянальнае напружанне з нервовай сістэмы.

Пагаршае гіпадынамія і работу страўнікава-кішачнага тракту: не засвойваюцца карысныя рэчывы, парушаецца абмен рэчываў. Нават пры нармальнай мадэлі харчавання, з адэкватнай каларыйнасцю, мяняецца мышачны рэльеф, зніжаецца мышачная маса і павялічваецца тлушчавая.

— Тэма гіпадынаміі цесна звязана з часам, які дзеці праводзяць у інтэрнэце. Выдаліць яго з жыцця немагчыма, дый не трэба, але карыстанне варта рэгламентаваць, — тлумачыць **загадчыца лабараторыі праблем здароўя дзяцей і падлеткаў РНПЦ «Маці і дзіця», кандыдат медыцынскіх навук, урач вышэйшай катэгорыі Маргарыта ДЗЕВЯЛТОЎСКАЯ.** — Для таго каб дзіця не згубілася ў сетках, не захаплялася віртуальнымі кантактамі больш, чым рэальнымі, неабходна яшчэ ад моманту цяжарнасці і, па меншай меры, да трох гадоў падтрымліваць з ім жывую размову, праяўляць зацікаўленасць. А сёння мы часта можам бачыць, як маладыя мамы адной рукой качаюць каляску, а другой перапісваюцца з сяброўкамі. Дзіця — само па сабе, што недапушчальна. Мама павінна пастаянна падтрымліваць стасункі з малым, размаўляць, слухаць разам музыку... Чым больш мама паказвае, чытае, тым лепшым будзе развіццё дзіцяці. Тут і рэгулярныя прагулкі. Калі актыўны лад жыцця будзе ўласцівы ўсёй сям'і, то гэта стане нормай для падрастаючага чалавека.

**Многім з нас даволі цяжка выштурхнуць сябе ў басейн ці на валейбол менавіта таму, што нашы бацькі не прывілі ў раннім узросце гэты навык рэгулярнай фізічнай нагрузкі.**

Добрыя стасункі паміж бацькамі і дзецьмі засцерагуць і ад парушэнняў харчовых паводзінаў — анарэксіі і булііміі. Звычайна гэта здараецца з падлеткамі, якія адчуваюць, што яны ўжо не дзеці, але ж яшчэ і не дарослыя. Ім хочацца прымаць самастойныя рашэнні, аднак псіхічна і фізіялагічна арганізм яшчэ не гатовы да гэтай самастойнасці. Псіхіка часам не вытрымлівае, дыскамфортны стан хочацца... заесці. Ежа ўсё ж такі заспакойвае. У мяккім варыянце падлетак будзе набіраць вагу, а ў больш жорсткім гэта можа быць, напрыклад, булімія, калі спачатку ўжываецца празмерная колькасць ежы, а затым выклікаюцца ваніты. Перыяды пераядання чаргуюцца з перыядамі галадання ■

### Якой павінна быць фізічная нагрузка?

На першым годзе жыцця дастаткова таго, што дзіця варочаецца, пасля сядзіць, пачынае паднімацца, хадзіць. Праўда, трэба пры гэтым прыглядаць за малым. А не ўсім хочацца. Прасцей, каб яно не круцілася, не коўзалася. Забяспечыць такі стан так проста з дапамогай гаджэтаў! І многія бацькі пры гэтым яшчэ ганарацца, што іх малое так добра націскае на кнопкі. Але спецыялісты пры гэтым б'юць трывогу. Мала таго, што гэта пачатак гіпадынаміі, дык яшчэ і дрэнны зрок у будучым. Знаходжанне ў сетках з самага ранняга ўзросту звязваецца спецыялістамі і з больш шырокім распаўсюджваннем аўтызму. Акрамя таго, ні пра які высокі інтэлект тут размова не ідзе. Механічна атрыманая інфармацыя з гаджэта не павышае каэфіцыент інтэлекту. Вядома, што для гэтага мозг павінен здабываць, перапрацоўваць, асэнсоўваць, аналізаваць інфармацыю!

Вылучаюць нагрузку цыклічную — плаванне, язда на веласіпедзе і ацыклічную (без пастаяннага цыклу) — гульня ў футбол, валейбол. Для школьнікаў рэкамендуецца тры дні на тыдні займацца ў якой-небудзь секцыі цыклічнай або ацыклічнай нагрузкай. У якасці аднаго з метадаў лячэння рэкамендуюцца спартыўныя секцыі і дзецям з гіперактыўнасцю.

■ Сямейны доктар

# Калі не трэба збіваць тэмпературу

**Ліхаманка з'яўляецца ў большасці выпадкаў абарончай рэакцыяй арганізма. Пры павышэнні тэмпературы цела многія вірусы і бактэрыі перастаюць размнажацца або гінуць, стымулюецца выпрацоўка антыцел, утварэнне інтэрферонаў. Акрамя таго, умераная ліхаманка — да 38,5 градусаў — не выклікае сур'ёзнага дыскамфорту. Таму дабівацца поўнай нармалізацыі тэмпературы не варта.**



Калі дзіця застаецца актыўным, не спяшайцеся з гарачкапаніжальнымі сродкамі. Сусветная арганізацыя аховы здароўя рэкамендуе лячыць ліхаманку пры вострых рэспіраторных інфекцыях у дзяцей з дапамогай гарачкапаніжальных прэпаратаў толькі тады, калі тэмпература перавышае 38,5 градусаў. Небяспека можа падсцерагаць пры тэмпературы звыш 41 градуса — гэта можа прывесці да пашкоджання нервовай сістэмы.

Пры 38—38,5 градуса гарачкапаніжальныя сродкі прызначаюцца толькі пры цяжкім захворванні дыхальнай, сардэчна-сасудзістай, нервовай сістэм, або калі раней былі сутаргі, або ўзрост дзіцяці да трох месяцаў.

— Ліхаманка не лічыцца абсалютным паказаннем да зніжэння тэмпературы, — кажа **ўрач-педыятр 3-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі Мінска Святлана ДЗЯРУГА.** — Калі ў дзіцяці без спадарожнай паталогіі тэмпературная рэакцыя носіць спрыяльны характар, тэмпература не вышэй за 39—39,5 °C і не аказвае адмоўнага ўплыву на стан дзіцяці, то ад выкарыстання лекавых сродкаў лепш устрымацца.

### Знізіць жар можна і без медыкаментаў

Каб узмацніць цеплааддачу, дзіця неабходна распрануць і пакласці кампрэс на буйныя сасуды — пахвінныя і падпахавыя, абцерці вадой пакаёвай тэмпературы. Гэтага цалкам дастаткова.

Абціраць дзіця спіртам або халоднай вадой не трэба. Рэзкае зніжэнне тэмпературы прыводзіць да спазму сасудаў, змяншае цеплааддачу. Не абавязкова дабівацца нармальных паказчыкаў тэмпературы, дастаткова панізіць яе на 1—1,5 градуса.

Калі на фоне ліхаманкі нават пры 38 градусах пагаршаецца стан, ёсць дрыжыкі, міяльгіі, дрэннае самаадчуванне, скура бледная і сухая, рукі-ногі халодныя, то гарачкапаніжальны сродак трэба даць тэрмінова!

**Матэрыялы падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

## Извещение об открытом аукционе по продаже земельных участков в собственность в г. Гродно (микрорайоны «Заболоть», «Барановичи-5,6», ул. Кульбакская, ул. Тетки) 12 декабря 2017 года

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Площадь земельного участка (га) | Кадастровый номер | Ориентировочная стоимость затрат на изготовление документации, руб. | Начальная цена продажи, руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Земельный участок У-231 * | микрорайон «Заболоть» | 0,0990 | 440100000003005285 | – | 13 037,57 | 2 700 |
| 2 | Земельный участок У-228* | микрорайон «Барановичи-5, 6» | 0,0964 | 440100000003005224 | – | 11 506,77 | 2 300 |
| 3 | Земельный участок У-3* | ул. Кульбакская в районе жилого дома № 35 | 0,0943 | 440100000001010122 | 3 400,0 | 20 355,33 | 4 700 |
| 4 | Земельный участок У-2*,** | в районе дома № 29 по ул. Тетки | 0,1114 | 440100000002009260 | 2 924,56 | 56 415,17 | 10 000 |

*Инженерные коммуникации на участке отсутствуют.

** Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании земельного участка в охранных зонах сетей и сооружений водоснабжения. На участке находятся хозяйственные постройки, которые подлежат сносу.

Земельные участки предоставляются в частную собственность для строительства одноквартирного жилого дома.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг "Гродненский центр недвижимости".

Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:

внесение платы за земельные участки; возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; получение победителями аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома; занятие земельных участков (осуществление строительно-монтажных работ) осуществить не позднее одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство одноквартирного жилого дома, возместить затраты в соответствии с решением Гродненского горисполкома от 08.02.2016 №49 «О некоторых вопросах возмещения затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры».

**Аукцион состоится 12 декабря 2017 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 (актовый зал).**

Для участия в аукционе необходимо: внести задаток в размере, указанном в графе 8, перечисляемый на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 в филиале №400 ГОУ ОАО АСБ «Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY21400, УНП 590727594, получатель – КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению.

Представить в КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» следующие документы;

заявление на участие в аукционе установленной формы;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;

дополнительно представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

**Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, каб. 57 с 13 ноября по 6 декабря 2017 года включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.**

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан:

внести плату за земельный участок; возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись;

выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Гродненский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли.

При невыполнении требований об обращении за государственной регистрацией прав на земельный участок в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признании аукциона продажи несостоявшимся решение Гродненского горисполкома о предоставлении земельного участка утрачивает силу.

Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

**Контактные телефоны: + 375 (152) 72 05 46, 72 05 37, официальный сайт организатора торгов www.grodno.gov.by**

---

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

| | |
|---|---|
| **Извещение о проведении повторного аукциона** | |
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | Ф-л «Несвижское управление магистральных газопроводов ОАО «Газпром трансгаз Беларусь», Минская обл., г. Несвиж |
| **Предмет аукциона** | |
| **Демонтированное оборудование АГЗС, расположенное по адресу: Минская обл., г. Несвиж, ул. Сновская, 7** | |
| **Лот №1** | |
| Емкость для хранения сжиженного углеводородного газа | |
| Емкость для хранения сжиженного углеводородного газа | |
| Насосный агрегат Hydro-Vacuum SKC | |
| Раздаточная колонка сжиженного газа Petrolmeccanica LPG 6000P | |
| Комплект трубопроводов с запорной и предохранительной аппаратурой | |
| **Начальная цена с НДС 20%** | **12 660,60 белорусских рублей (снижена на 15%)** |
| **Лот №2** | |
| Емкость для хранения сжиженного углеводородного газа | |
| Емкость для хранения сжиженного углеводородного газа | |
| Насосный агрегат Hydro-Vacuum SKC | |
| Раздаточная колонка сжиженного газа Petrolmeccanica LPG 6000P | |
| Комплект трубопроводов с запорной и предохранительной аппаратурой | |
| **Начальная цена с НДС 20%** | **12 660,60 белорусских рублей (снижена на 15%)** |
| **Лот №3** | |
| Емкость для хранения сжиженного углеводородного газа | |
| Емкость для хранения сжиженного углеводородного газа | |
| Насосный агрегат Hydro-Vacuum SKC | |
| Раздаточная колонка сжиженного газа DPC050 LE1D | |
| Комплект трубопроводов с запорной и предохранительной аппаратурой | |
| **Начальная цена с НДС 20%** | **12 740,34 белорусских рублей (снижена на 15%)** |
| **Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – BY76BLBB30120191021390001004; в евро (EUR) – BY33BLBB30120191021390001002; в российских рублях (RUB) – BY22BLBB30120191021390001006 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после проведения аукциона |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия | |
| Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 02.06.2017 г. | |
| **Дата и время проведения аукциона** | **01.12.2017** в 14.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **29.11.2017** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. Email: auction@cpo.by |

---

## Объявление о повторных торгах

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества и его стоимость** | Лот №1. Токарно-винторезный станок 1К62, инв. №160021, стоимостью 964,46 рублей<br>Лот №2. Токарно-винторезный станок 1К62Д, инв. №160017,стоимостью 2 162,37 рублей<br>Лот №3. Токарно-винторезный станок 16Д20, инв. №160025, стоимостью 1 491,07 рублей<br>Лот №4. Верт. сверл. станок 2Н-1 18, инв. №210027, стоимостью 630,64 рублей<br>Лот №5. Верт. сверл. станок 2Н-135, инв. №210023, стоимостью 765,37 рублей<br>Лот №6. Коорд. расточной станок 2421СФ1, инв. №240005, стоимостью 1 941,84 рублей<br>Лот №7. Плоскошлиф. станок с ЧПУ 3Е71 1ВФ2, инв. №377002, стоимостью 2 614,46 рублей<br>Лот №8. Вертикально-фрезерный станок 6Р11, инв. №620022, стоимостью 1 663,90 рублей<br>Лот №9. Гориз. фрезерный станок 6Р8 1 Г, инв. №620027, стоимостью 730,98 рублей<br>Лот №10. Токарно-винторезный станок 1К62Д, инв. №160018, стоимостью 2 000,80 рублей<br>Лот №11. Верт. фрезерный станок 6Р1 1, инв. №620017, стоимостью 1 422,56 рублей<br>Лот №12. Токарно-винторезный станок 16Д20, инв. №160020, стоимостью 1 491,07 рублей<br>Лот №13. Плоскошлифовальный станок 3Е711В, инв. №370007, стоимостью 1 534,02 рублей |
| **Собственник (владелец) имущества** | ОАО «Завод ПАК» (УНН 300228919) |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | г. Орша, ул. Ленина, 223 |
| **Наличие обременений** | Нет |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | 28.11.2017 в 11.00<br>г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 1.4 |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | Управление принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома<br>210015, г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1.<br>Судебный исполнитель – Ильющенков Алексей Александрович, тел./факс: 8(0212)614018, 8(033)6879145 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | Лицо, желающее принять участие в повторных торгах, до начала торгов обязано:<br>1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет главного управления юстиции Витебского облисполкома №BY73AKBB36429030010372000000 в 200-м филиале ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Витебска, БИК AKBBBY21200, УНП 300002505, не позднее 15.00 27.11.2017.<br>Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота.<br>В соответствии с частью 3 статьи 401 Хозяйственного процессуального кодекса Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется покупателем имущества |

---

## Информационное сообщение о проведении аукциона по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в дер. Мостище (участок № 2), дер. Лужки, ул. Банная (участок № 4), дер. Скураты, ул. Центральная, дер. Рудомейка (участок № 1), дер. Прилепская Усяжка (участок № 2) Озерицко-Слободского сельсовета Смолевичского района Минской области

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Форма проведения аукциона | Открытый |
| 2 | Дата, время и место проведения аукциона | 14 декабря 2017 года, в 11.00, аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27, Озерицко-Слободской сельисполком, зал заседаний |
| 3 | Продавец и его адрес | Озерицко-Слободской сельисполком, аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27 |
| 4 | Земельный участок, его кадастровый номер и адрес | Лот №1– площадь 0,0997 га №624883007101000094 дер. Мостище (уч. №2)<br>Лот №2 – площадь 0,1455 га №624883005601000178 дер. Лужки, ул. Банная (уч. №4)<br>Лот №3 – площадь 0,1500 га №624883009101000206 дер. Скураты, ул. Центральная<br>Лот №4 – площадь 0,1388 га №624883008601000095 дер. Рудомейка (уч. №1)<br>Лот №5 – площадь 0,1098 га №624883008201000112 дер. Прилепская Усяжка (уч. №2) |
| 5 | Условия продажи | Без изменения целевого назначения |
| 6 | Целевое назначение земельного участка | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома<br>(10904 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) |
